Пролетарии всех стран, соединяйтесь!


СВЯЗЬ СОВЕТСКИХ ОРГАНОВ МЕЖДУ СОБОЙ И МАССАМИ — ОСНОВА СОВЕТСКОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

БЮЛЛЕТЕНЬ
СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР

1-й год ИЗДАНИЯ

№ 8

ДЕКАБРЬ
1925 г.



ИЗДАНИЕ НКВД БССР
МИНСК—1925

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

СВЯЗЬ СОВЕТСКИХ ОРГАНОВ МЕЖДУ СОБОЙ И МАССАМИ — ОСНОВА СОВЕТСКОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

БЮЛЛЕТЕНЬ
СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР

1-й год ИЗДАНИЯ № 8 ДЕКАБРЬ 1925 г.

ИЗДАНИЕ НКВД БССР
МИНСК—1925



Минск, 1-я Гостипография. Заказ № 848—3000 экз. Главлитбел № 14517.

Постановление Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР об утверждении положения о государственном обеспечении нетрудоспособных членов семей военнослужащих, инвалидов войны и некоторых других категорий лиц, неспособных к труду.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Утвердить прилагаемое положение о государственном обеспечении нетрудоспособных членов семей военнослужащих, инвалидов войны и некоторых других категорий лиц, неспособных к труду.

2. Признать утратившими силу все ранее изданные постановления по предусмотренным в Положении вопросам.

3. Предоставить Народному Комиссариату Социального Обеспечения право издавать в развитие названного Положения циркуляры и инструкции.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР *А. Червяков.*

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР *А. Адамович.*

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР *Д. Чернушевич.*

13 ноября 1925 г.

Положение о государственном обеспечении нетрудоспособных членов семей военнослужащих, инвалидов войны и некоторых других категорий лиц, неспособных к труду.

I. Общая часть.

1. Правом на государственное обеспечение, согласно настоящего Положения, пользуются нижеследующие лица, не лишенные по конституции БССР избирательных прав:

а) члены семейств лиц, призванных в ряды Красной Армии и Флота;

б) инвалиды войны и лица, пострадавшие от контр-революции;

в) члены семейств военнослужащих, инвалидов войны и лиц, пострадавших от контр-революции, умерших или без вести пропавших;

г) утратившие трудоспособность лица, имеющие особые заслуги перед революцией или в области науки, а равно нуждающиеся нетрудоспособные члены их семей;

д) глухонемые, слепые и престарелые, впавшие в нужду и нетрудоспособные к труду.

II. Обеспечение семей лиц, призванных в ряды Красной Армии и Флота.

2. Государственному обеспечению подлежат следующие члены семейств лиц, призванных в ряды Красной Армии и Флота, если они до призыва последних находились на их иждивении:

а) дети, а также братья и сестры—круглые сироты в возрасте до 16 лет или хотя и достигшие этого возраста, но совершенно нетрудоспособные;

б) нетрудоспособные жены или хотя и трудоспособные, но имеющие детей до 8-ми летнего возраста;

в) нетрудоспособные отец и мать, отнесенные к первым трем группам инвалидности (ст. 10), если в семье отсутствуют другие трудоспособные лица.

3. Указанные в ст. 2 лица пользуются государственным обеспечением во время службы красноармейца и в течение года со дня его увольнения.

4. Указанные в ст. 2 лица обеспечиваются помещением в первую очередь перед прочими гражданами в учреждения Народного Комиссариата Социального Обеспечения, Народного Комиссариата Здравоохранения и Народного Комиссариата Просвещения, причем в учреждения Народного Комиссариата Здравоохранения и Народного Комиссариата Просвещения они направляются Народным Комиссариатом Социального Обеспечения и его органами.

5. Тем из членов семей красноармейцев и военморов, которых не представляется возможным обеспечить помещением в учреждения Народного Комиссариата Здравоохранения, Народного Комиссариата Просвещения и Народного Комиссариата Социального Обеспечения, — выдается Народным Комиссариатом Социального Обеспечения денежная помощь в зависимости от числа членов семьи.

6. Перечисленные в настоящем разделе лица, обслуживаются органами здравоохранения бесплатной медицинской помощью.

III. Государственное обеспечение инвалидов войны и лиц, пострадавших от контр-революции.

7. Право на получение государственного обеспечения имеют инвалиды гражданской или империалистической войны, потерявшие трудоспособность во время нахождения на военной службе или в связи с прохождением военной службы.

8. Государственное обеспечение инвалидов войны состоит или в помещении в учреждения для инвалидов, или в назначении денежной пенсии или пособия или же в предоставлении им известных льгот и содействия.

9. Государственное обеспечение инвалидам назначается в зависимости:

а) от степени утраты трудоспособности и рода работы, которую могут выполнять инвалиды;

б) от имущественной обеспеченности;

в) от семейного положения инвалидов.

10. Все инвалиды в зависимости от степени утраты трудоспособности и рода работы, которую они могут выполнять, делятся на следующие группы:

1-ая—инвалиды, неспособные к труду для заработка и нуждающиеся в постороннем уходе для удовлетворения обычных жизненных потребностей;

2-ая—инвалиды, неспособные ни к какому труду, дающему заработок, но не нуждающиеся в постороннем уходе для удовлетворения обычных жизненных потребностей;

3-я—инвалиды, не только вынужденные отказаться от своей обычной профессии, но и вообще неспособные ни к какой регулярной

работе и могущие добывать средства к существованию лишь легкой нерегулярной работой;

4-я—лица, вынужденные перейти к другой профессии более низкой квалификации;

5-я—лица, вынужденные отказаться от своей обычной профессии и перейти к другой профессии такой же квалификации при содействии Народного Комиссариата Социального Обеспечения.

6-я—лица, могущие продолжать прежнюю деятельность, но с пониженной производительностью.

11. В учреждения Социального Обеспечения—инвалидные дома Народным Комиссариатом Социального Обеспечения и его органами на местах принимаются исключительно инвалиды первой и второй группы. Инвалидам войны третьей группы выдается установленная пенсия.

Примечание. Условия и порядок приема в инвалидные дома, отказа в приеме, а равно исключения из этих домов устанавливаются инструкцией Народного Комиссариата Социального Обеспечения.

12. Все инвалиды войны первой и второй групп, находящиеся в учреждениях социального обеспечения, получают все виды обеспечения, устанавливаемые Народным Комиссариатом Социального Обеспечения в пределах отпускаемых на это кредитов.

13. В случае невозможности по каким-либо причинам помещения инвалидов войны первой и второй групп в учреждения Народного Комиссариата Социального Обеспечения им выдается пенсия в зависимости от группы.

14. Пенсия выдается по ставкам, вырабатываемым Народным Комиссариатом Социального Обеспечения и утверждаемым Советом Народных Комиссаров.

15. Народному Комиссариату Социального Обеспечения и его органам на местах предоставляется право взамен денежного обеспечения помещать пенсионеров-инвалидов, отнесенных к 3-й группе инвалидности, в колонии, мастерские и другие производственно-потребительские и кооперативные инвалидные об'единения.

16. Инвалиды войны 1, 2 и 3 групп пользуются льготами в области налоговой, по уплате коммунальных услуг и т. п. на основании действующих законов и распоряжений.

17. Инвалиды войны, не получившие пенсии без уважительных причин в течение одного года со дня последней выдачи таковой, теряют право на все неполученные суммы пенсии, которые перечисляются в этом случае в доход казны.

18. Пенсия выдается со дня возбуждения о том ходатайства, поданного в установленном порядке с представлением всех необходимых документов по день смерти пенсионера, если только трудоспособность его не восстановится до нормы, по которой пенсия не выдается.

19. Инвалиды войны 4, 5 и 6 групп (ст. 10) помещаются в трудовые и кооперативные инвалидные об'единения и сверх того пользуются льготами по оплате коммунальных услуг и по сельско-хозяйственному налогу на основании действующих законов и распоряжений.

20. Все инвалиды гражданской и империалистической войны, лишившиеся конечностей, имеют право на бесплатное получение протезов от Народного Комиссариата Здравоохранения, для чего Народный Комиссариат Социального Обеспечения и его органы на местах

ведут учет инвалидов, нуждающихся в протезах, и препровождают их списки в Народный Комиссариат Здравоохранения.

Примечание. Опротезирование отдельных инвалидов производится в порядке, установленном Народным Комиссариатом Здравоохранения совместно с Народным Комиссариатом Социального Обеспечения.

21. Правила, изложенные в ст. ст. 7—20, распространяются также и на лиц, пострадавших от контр-революции.

22. Перечисленные в настоящем разделе лица обслуживаются органами Здравоохранения бесплатной медицинской помощью.

IV. Государственное обеспечение членов семейств умерших или без вести пропавших военнослужащих, инвалидов войны и лиц, пострадавших от контр-революции.

23. В случае смерти военнослужащего или состоящего на государственном обеспечении инвалида войны, а равно в том случае, когда в надлежащем порядке установлено, что военнослужащий без вести пропал, подлежат социальному обеспечению члены их семей, перечисленные в ст. 2 Положения, если они состояли на их иждивении и не имеют средств к существованию.

24. Означенные в ст. 23 лица пользуются государственным обеспечением в следующем порядке: на одно нетрудоспособное лицо в семье назначается треть (1/3) пенсии, выдаваемой инвалидам первой группы, на двух нетрудоспособных—половина (1/2), на трех и более нетрудоспособных две трети (2/3) той же пенсии (ст. 14).

25. Пенсия выдается нетрудоспособным членам семьи умершего или без вести пропавшего военнослужащего, или состоявшего на гособеспечении инвалида войны (ст. 23), со дня возбуждения о том ходатайства в установленном порядке с представлением всех необходимых документов, причем малолетним детям его до достижения ими 16-ти летнего возраста, а прочим нетрудоспособным членам семьи до их смерти, если только ранее этого срока их трудоспособность не восстановится до нормы, по которой пенсия не выдается. Трудоспособным женам, занятым уходом за малолетними детьми умершего или без вести пропавшего военнослужащего, пенсия выдается до достижения этими детьми 8-ми летнего возраста.

26. Правила, изложенные в ст. ст. 23—25, распространяются также на семьи лиц, пострадавших от контр-революции.

27. Перечисленные в настоящем разделе лица обслуживаются органами здравоохранения бесплатной медицинской помощью.

V. Персональные пенсии и пособия.

28. Персональные пенсии и единовременные пособия назначаются лицам, имеющим исключительные заслуги перед Республикой в области революционной деятельности профессионального движения, а также в области науки, искусства, техники и государственной службы.

29. Персональные пенсии и единовременные пособия выдаются лицам, перечисленным в предыдущей статье, при полной или частичной утрате ими трудоспособности, а в случае их смерти или безвестного отсутствия—нетрудоспособным или несовершеннолетним (до 16 л.) членам семьи, находящимся на иждивении указанных лиц.

30. Персональные пенсии определяются в зависимости от степени и характера исключительных заслуг лиц, указанных в ст. 28 Положения, степени утраты трудоспособности, количества нетрудоспособных членов семьи, находящихся на их иждивении, состояния здоровья

нуждаемости и вообще всей совокупности обстоятельств в каждом отдельном случае в пределах до удвоенной высшей тарифной ставки БССР.

31. В случае смерти или безвестного отсутствия лица, имеющего право на персональную пенсию, семье его выдается: при одном нетрудоспособном члене половина ($^{1}/_{2}$), при двух нетрудоспособных две трети ($^{2}/_{3}$), при трех и более—полная пенсия, которую получал или мог бы получить умерший или без вести отсутствующий.

32. Сверх персональных пенсий и независимо от назначения таковых лицам, указанным в ст. 28 Положения, а в случае их смерти или установленного безвестного отсутствия—членам их семей, упомянутым в ст. 29, могут быть выдаваемы единовременные пособия на погребение, лечение и в других исключительных случаях.

33. Единовременные пособия назначаются в размере, устанавливаемом в каждом отдельном случае в зависимости от степени и характера заслуг, нуждаемости, состояния здоровья, необходимых расходов, связанных с той целью, для которой испрашивается пособие, и прочих обстоятельств—в пределах не свыше двухкратного размера установленной пенсии.

34. Перечисленные в настоящем разделе лица обслуживаются органами здравоохранения бесплатной медицинской помощью.

VI. Обеспечение глухонемых, слепых и престарелых.

35. Глухонемые и слепые, не обученные в специальных учреждениях, не обладающие еще определенными профессиональными навыками и притом одинокие, подлежат социальному обеспечению.

36. Глухонемые и слепые дошкольного и школьного возраста должны воспитываться в специальных учреждениях Народного Комиссариата Просвещения, а взрослые, неспособные к обучению (слабоумные и идиоты), притом одинокие, помещаются в соответствующие учреждения Народного Комиссариата Социального Обеспечения.

37. Глухонемые и слепые внешкольного возраста, могущие получить общее или специальное образование, состоят на попечении Народного Комиссариата Просвещения, а способные к обучению только ремеслам—на попечении Народного Комиссариата Социального Обеспечения, об'единяющего их в трудовые артели и производственно—потребительские кооперативные организации.

38. Глухонемые и слепые, неспособные к обучению по слабости, идиотизму или другим физическим недостаткам и не имеющие права на социальное обеспечение, помещаются в соответствующие учреждения Народного Комиссариата Социального Обеспечения.

39. Лица престарелые, впавшие в нужду и притом одинокие, если они не имеют права на социальное страхование, помещаются в дома для престарелых, а где таких домов нет,—получают временное пособие.

40. Перечисленные в настоящем разделе лица, обслуживаются органами здравоохранения бесплатной медицинской помощью.

VII. Порядок назначения обеспечения.

41. Все лица, имеющие право на государственное обеспечение, согласно настоящего Положения, за исключением означенных в ст. 28-34, подают в Отдел Социального Обеспечения Окружного Исполнительного Комитета по месту своего постоянного жительства заявление о назначении обеспечения с представлением подтверждающих это их право соответствующих документов.

Примечание. Члены семей красноармейцев должны представить удостоверение о нахождении их кормильца в рядах Красной

Армии и Флота. При этом факт нахождения кормильца в Красной Армии или Флоте должен подтверждаться для продления обеспечения ежегодно.

42. Лицо, возбуждающее ходатайство о государственном обеспечении по инвалидности, предварительно подает заявление в Районную, а где таковой нет—в Окружную Комиссию по установлению инвалидности, которая в недельный срок обязана направить акт освидетельствования в подлежащий Отдел Социального Обеспечения Окружного Исполнительного Комитета с указанием группы инвалидности, возможности и срока восстановления трудоспособности, срока переосвидетельствования и характера работ, которые может выполнить заявитель.

Примечание. Лица, недовольные постановлением Районной или Окружной Комиссии, вправе обжаловать таковой в месячный срок в Центральную Комиссию при Народном Комиссариате Здравоохранения БССР, решение которой считается окончательным и обжалованию не подлежит.

43. Для рассмотрения вопроса о назначении государственного обеспечения при Отделе Социального Обеспечения Окружного Исполнительного Комитета под председательством заведывающего отделом или заведывающего п/отделом государственного обеспечения действует комиссия из представителей Окружного Комиссариата по военным делам, Финансового Отдела Окружного Исполнительного Комитета, Окружного Бюро Профессиональных Союзов и Крестьянского Комитета Общественной Взаимопомощи.

44. Лицо, недовольное постановлением Комиссии при Отделе Социального Обеспечения Окружного Исполнительного Комитета, может в 2-х недельный со дня об'явления постановления срок обжаловать данное постановление в Междуведомственную Комиссию по назначению пенсий и пособий при Народном Комиссариате Социального Обеспечения (ст. 6 Положения о Народном Комиссариате Социального Обеспечения БССР). Жалоба подается через Комиссию при Отделе Социального Обеспечения Окружного Исполнительного Комитета.

45. Решение Комиссии об удовлетворении ходатайства или об отказе в таковом представляется на утверждение в Междуведомственную Комиссию по назначению пенсий и пособий при Народном Комиссариате Социального Обеспечения: по обжалованным решениям в трехдневный срок по обжаловании, а при отсутствии жалоб—по истечении двух недель со дня вынесения решения.

46. Междуведомственная Комиссия по назначению пенсий и пособий при Народном Комиссариате Социального Обеспечения в одном из ближайших заседаний проверяет все производство о заявителе и утверждает постановление Комиссии при Отделе Социального Обеспечения Окружного Исполнительного Комитета или изменяет таковое, вынося в этом последнем случае на основании всех обстоятельств дела свое решение или отменяет постановление этой Комиссии и возвращает ей дело для вынесения нового постановления. Решения Междуведомственной Комиссии при Народном Комиссариате Социального Обеспечения окончательны и обжалованию не подлежат.

47. Просьбы лиц, указанных в ст. ст. 28—34, подаются центральным ведомствам, учреждениям, профессиональным или иным общественным организациям, к ведению которых относится деятельность этих лиц, и ими направляются, с их заключением в Народный Комиссариат Социального Обеспечения. Ходатайства о назначении персональных пенсий или пособий могут быть возбуждаемы означенными

ведомствами, учреждениями и организациями и независимо от просьбы лиц, коим эти пенсии или пособия предназначаются. Ходатайства о назначении персональных пенсий и пособий рассматриваются и разрешаются исключительно в Междуведомственной Комиссии по назначению пенсий и пособий при Народном Комиссариате Социального Обеспечения.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР *А. Червяков.*

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР *И. Адамович.*

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР *Д. Чернушевич.*

13 ноября 1925 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР аб зацьверджаньні інструкцыі да часовых правіл аб умовах ужываньня дапаможнае наёмнае працы ў сялянскіх гаспадарках.

На падставе артыкула 22-га, зацьверджаных 18 красавіка 1925 г. Саветам Народных Камісараў Саюзу ССР „часовых правіл аб умовах ужываньня дапаможнае наёмнае працы ў сялянскіх гаспадарках“ (ЗЗ СССР № 26 арт. 183) Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ: зацьвердзіць наступную інструкцыю аб парадку ўжываньня названых вышэй часовых правіл:

1. Дзейнасьць часовых правіл пашыраецца на ўсе працоўныя сялянскія гаспадаркі, як на землях аддадзеных у іх працоўнае карыстаньне дзяржаваю, гэтак і на землях, што арандуюцца імі, у якіх наёмная праца ўжываецца, як дапаможная.

Часовыя правілы не пашыраюцца на гаспадаркі, якія сыстэматычна патрабуюць па свайму гаспадарчаму ўхілу і разьмерах сталага ўжываньня наёмнае працы ў ліку болей 2-х сталых рабочых.

Увага: На гаспадаркі, якія грунтоўна паляпшаюць глебу, як напрыклад: мэліорацыя, дрэнажыраваньне і г. д., часовыя правілы пашыраюцца, калі лік сталых рабочых ня будзе больш 3-х чалавек.

2. Умовы найму парабкаў і парабчанак вызначаецца па ўзаемнай згодзе наймальніка з парабкамі (парабчанкамі) ці з профэсыянальным саюзам.

Пры найме парабка ці парабчанкі наймальнік павінен заключыць з імі ці з профэсыянальным саюзам, які дзейнічае ад іх імя, пісаны працоўны дагавор.

Умовы працоўнага дагавору ня могуць быць горшымі за ўмовы прадугледжаныя часовымі правіламі і гэтай інструкцыяй.

Увага: Калі парабак ці парабчанка наймаюцца ня болей як на адзін тыдзень працаваць без перапынку або ня болей, як на тры тыдні ў годзе працаваць з перапынкамі, заключаць пісаны дагавор неабавязкова, але становішча парабка ці парабчанкі ня можа быць горшым ад прадугледжанага часовымі правіламі і гэтай інструкцыяй.

3. Недалеткі ад 14 год маюць права заключаць працоўны дагавор так, як і дарослыя. За недалеткаў ад 12 да 14 год працоўны дагавор заключаюць з іх ведама іх бацькі ці апякуны.



Ва ўсіх гэтых выпадках бацькі ці апякуны, а таксама профэсыянальны Саюз і інспэктары працы могуць патрабаваць датэрміновай адмены працоўнага дагавору, калі далейшае існаваньне яго пагражае здароўю недалетка ці наогул становіцца шкодным для яго.

4. Працоўны дагавор павінен быць падпісаны старанамі і пададзены наймальнікам для рэгістрацыі ў Сельскі Савет не пазьней двох тыдняў пасьля заключэньня.

У працоўным дагаворы подпісы за няпісьменнага ці ўмоўныя знакі няпісьменнага парабка ці наймальніка павінны быць пасьведчаны Сельскім Саветам дарам.

5. Працоўныя дагаворы складаюцца і падпісваюцца старанамі ў 3-х экзэмплярах, з якіх адзін застаецца ў Сельскім Савеце. а два другія пасьля рэгістрацыі выдаюцца на рукі наймальніку і парабку.

6. Калі адна ці абедзьве стораны няпісьменны, працоўны дагавор перад рэгістрацыяй павінен быць прачытаны голасна прадстаўніком Сельскага Савету.

7. За рэгістрацыю дагавору і за пасьведчаньне подпісаў Сельскія Саветы ня маюць права браць плату. Сельскія Саветы таксама ня маюць права нічога зьмяняць у дагаворы.

8. Інспэктар працы можа патрабаваць зьмяненьня ці адмены працоўных дагавораў, якія пагаршаюць становішча парабкаў і парабчанак у параўнаньні з часовымі правіламі і гэтай інструкцыяй.

Патрабаваньне аб пераглядзе ці адмене працоўнага дагавору можа быць пададзена таксама профэсыянальным саюзам праз адпаведныя органы (інспэктара працы, працоўную сэсію ці народны суд).

9. Па добравольнай згодзе профэсыянальнага саюзу з наймальнікам можа быць агаворан абавязак наймальніка уносіць на працу профэсыянальнага саюзу пэўную суму, якая ня можа перавышаць двох процантаў абумоўленай у дагаворы заработнай платы парабка ці парабчанкі.

10. У працоўным дагаворы павінен быць дакладна зазначан тэрмін найма парабка (напрыклад з 1 сакавіка па 1 кастрычніка) таксама тыя галоўныя работы, для выпаўненьня якіх наняты батрак (пасеў, ворыва, прыбіраньне ўраджаю, малацьба і г. д.).

11. Наймальнік павінен выплачваць заработную плату парабку ці парабчанцы ў вызначаныя ў працоўным дагаворы тэрміны. Пры звальненьні парабка ці парабчанкі па сканчэньні тэрміну дагавору наймальнік павінен заплаціць звальняемаму пэнсію па дзень фактычнага разьліку з ім.

12. У працоўным дагаворы можа быць зазначана па згодзе паміж старанамі абавязацельства наймальніка адплаціць парабку ці парабчанцы страты, якія здарацца ў зьвязку з адмоваю наймальніка даць парабку (парабчанцы) работу пасьля дагавору аб найме.

13. Працоўным дагаворам могуць устанаўляцца пені з наймальніка за несваячасную выплату заработнае платы.

14. Заработная плата парабка ці парабчанкі (грашовая і натуральная разам) не павінна быць ніжэй устаноўленага Народным Камісарыятам Працы СССР для данай мясцовасьці дзяржаўнага мінімуму. Пры гэтым кошт харчоў і кватэры лічыцца ў разьмеры ня болей 50 проц. вызначанага дзяржаўнага мінімуму.

15. Працоўныя дагаворы (умовы) могуць заключацца на тэрмін ня болей аднаго году. Заключаць працоўныя дагаворы, выкананьне якіх пачынаецца не ў бягучым годзе ці ў будучым сельска-гаспадарчым сезоне, забараняецца.

16. Велічыня рабочага дня парабка ці парабчанкі ўстанаўляецца па згодзе старон для кожнае пары году ў асобку ў залежнасьці ад напружанасьці работы ў асобныя сельска-гаспадарчыя сэзоны, пры гэтым запіс велічыні рабочага дня ў працоўным дагаворы павінен рабіцца асобна для кожнага сельска-гаспадарчага сэзону.

17. У лік сьвяточных і непрацоўных дзён, у якія парабак ці парабчанка звальняюцца ад работы, уваходзяць аднадзенны адпачынак раз у тыдзень у любы дзень па згодзе наймальніка з парабкам ці парабчанкаю, рэволюцыйныя сьвяты: 1-е і 22-е студзеня, 12-е і 18-е сакавіка, 1-е мая і 7-е лістапада, а таксама іншыя сьвяты, якія ўстанаўляе Народны Камісарыят Працы БССР.

18. Работа ў сьвяточныя і непрацоўныя дні дапушчаецца па згодзе старон і толькі ў выпадку сапраўднай неабходнасьці тэрміновага выкананьня якое-небудзь работы. У гэтым разе наймальнік, па згодзе з батраком, павінен ці даць яму другі свабодны ад работы дзень, ці выдаць дадатковае ўзнагараджаньне ў разьмерах, вызначаных працоўным дагаворам.

19. Падросткі да 14 год могуць дапушчацца толькі на асабліва лёгкія работы, а цяжарныя жанчыны не дапушчаюцца на цяжкія і шкодныя работы ў сельскай гаспадарцы. Пералік тых і іншых работ устанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

20. Наймальнік абавязан даць парабку кватэру і харчы, калі гэта прадугледжана ў дагаворы, пры гэтым харчы павінны быць аднолькавыя з харчамі сям'і наймальніка.

21. Рабіць самастойна затрыманьні і адлічэньні з заработнай платы парабка ці парабчанкі наймальнік ня мае права. У выпадках, калі парабкам ці парабчанкаю будзе зроблена наймальніку наўмысная шкода сапсаваньнем ці згубаю маемасьці наймальніка, апошні можа падаць на парабка ці парабчанку іск аб адплаце шкоды праз міравую комісію пры Раённым Выканаўчым Комітэце ці праз працоўную сэсію і народны суд.

22. У выпадку родаў парабчанкаю ці ў выпадку цяжкай хваробы або няшчаснага здарэньня з парабкам ці парабчанкаю, наймальнік павінен або завезьці хворага (хворую) да доктара, у больніцу ці на мэдыцынскі пункт, або прывезьці доктара, фэльчара ці акушорку да хворага (хворай).

23. Калі з незастрахаваным парабкам (парабчанкай) у часе ці ў зьвязку з работай у наймальніка здарылася няшчасьце, наймальнік павінен адплаціць батраку за шкоду ад гэтага здарэньня ў выпадку і разьмерах, устаноўленых належным судом (арт. арт. 403 і 406-411 Грамадзянскага Кодэксу БССР).

Калі парабак ці парабчанка былі застрахованы, наймальнік нясе адказнасьць за няшчаснае здарэньне толькі тады, калі ён выклікан злачыннаю дзейнасьцю ці бязьдзейнасьцю наймальніка.

24. Сялянская гаспадарка, якая карыстаецца наёмнаю працаю ў працягу ўсяго сельска-гаспадарчага году, павінна пры хваробе парабка ні парабчанкі, а таксама пры родах апошняй, калі парабак ці парабчанка працавалі ў данай гаспадарцы ня менш месяцу, выплачваць ім вызначаную ў дагаворы заработную плату і даваць кватэру і харчы ў працягу аднаго месяца з моманту спыненьня працы па прычыне хваробы ці родаў.

Сялянская гаспадарка, якая карыстаецца наёмнаю працаю толькі ў паасобныя пэрыоды сельска-гаспадарчых работ, павінна выплачваць вызначаную ў дагаворы заработную плату і даваць кватэру і харчы ў

працягу двох тыдняў з моманту спыненьня працы па прычыне хваробы ці родаў, калі парабак ці парабчанка працавалі ў гэтай гаспадарцы ня менш двох тыдняў.

Лячэбныя органы і ўстановы павінны дарам лячыць парабкаў і парабчанак у часе хваробы і родаў.

25. У выпадку хваробы парабка ці парабчанкі або родаў у вапошняй наймальнік мае права наймаць да выздараўленьня захварэўшага часовага работніка з захаваньнем правіл гэтай інструкцыі.

Па выздараўленьні парабка ці парабчанкі наймальнік павінен прыняць выздаравеўшага на работу, калі да таго часу ня скончыўся тэрмін працоўнага дагавору.

26. Пры звальненьні наймальнікам парабка ці парабчанкі раней тэрміну і нязгоды зволенага з мотывамі звальненьня конфлікт вырашаецца міравою комісіяй, а пры недасягненьні згоды працоўнай сэсіяй ці народным судом.

Увага: Звальненьне парабка ці парабчанкі таму, што ён прымае ўдзел у грамадзянскай працы ці лічыцца членам профсаюзу зьяўляецца незаконным, пры гэтым грамадзянскія абавязкі парабкам ці парабчанкаю выконваюцца не ў рабочы час, які абумоўлен працоўным дагаворам, за выняткам выбараў у Саветы і ўдзелу на агульных сходах.

27. Разьмер выходной дапамогі пры звальненьні раней тэрміну вызначаецца з разьліку заработнай платы, грашовай і натуральнай— згодна арт. 89 і 90 Кодэксу Законаў аб Працы.

28, Разьбіраньне ў міравых комісіях пры Раённых Выканаўчых Комітэтах конфліктаў і спрэчак, якія ўзьнікаюць паміж наймальнікам і батраком, робіцца бяз жадных збораў, не пазьней тыднёвага тэрміну з дня паданьня заявы аднэй з старон.

Парадак вырашэньня спрэчак і конфліктаў па працоўных дагаворах ў міравых комісіях вызначаецца інструкцыяй Народнага Камісарыяту Працы і Народнага Камісарыяту Ўнутраных Спраў БССР.

29. Пры ўзьнікненьні паміж наймальнікам і парабкам (парабчанкаю) спрэчкі аб разьмеры заработнай платы, у выпадку адсутнасьці пісанага працоўнага дагавору ці пры адсутнасьці ў ім дакладнага вызначэньня разьмеру заработнай платы, наймальнік павінен плаціць парабку (парабчанцы) заработную плату ў разьмеры сярэдняга заработку данае катэгорыі рабочага ў данай мясцовасьці і адпаведна з іншымі ўмовамі працы ня ніжэй нормаў часовых правіл.

30. Гэтая інструкцыя павінна быць вывешана на відных мясцох ва ўсіх Раёных Выканаўчых Комітэтах і Сельскіх Саветах.

Намесьнік Старшыні Савету
Народных Камісараў БССР *С. Гэльтман.*

Час. вык. аб. Кіраўніка Спраў Савету
Народных Камісараў БССР *С. Крэндзель.*

12-га жніўня 1925 г.

Постановление Совета Народных Комиссаров БССР о ставках дополнительной ренты для городских земель на 1924-25 бюдж. год.

На основании постановления Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР от 12 ноября 1923 г. о взимании ренты с земель городских и предоставленных транспорту (Вестник ЦИК, СНК и СТО 1923 г. № 11), Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

Приложение.

ТАБЕЛЬ

ставок дополнительной ренты для земель городов и городских поселений БССР на 1924-25 б. г.

Группы город. посел.	ГОРОДА	Ставки основн. ренты	РАЙОНЫ	Ставки дополн. ренты для: (в коп. с кв. саж.). Огородов	Садов	посторoек и дворов: Деревянных	Камен. 1 этаж. и смеш.	Камен. 2 и более этаж.
1	Минск и Витебск	0,6	1. Торговый	—	—	24,0	48,0	100,0
			2. Торг.-жил.	2,0	4,0	8,0	16,0	32,0
			3. Жилой	1,0	2,0	4,0	8,0	16,0
			4. Редко-зас.	0,6	1,0	2,0	4,0	8,0
2	Могилев и Бобруйск	0,5	1. Торговый	—	—	14,0	28,0	50,0
			2. Торг.-жил.	1,4	2,0	7,0	14,0	28,0
			3. Жилой	0,7	1,0	3,5	7,0	14,0
			4. Редко-зас.	0,5	0,7	1,8	3,5	7,0
3	Орша, Полоцк, Борисов	0,4	1. Торговый	—	—	10,0	20,0	30,0
			2. Торг.-жил.	1,2	1,8	5,0	10,0	20,0
			3. Жилой	0,6	0,9	2,5	5,0	10,0
			4. Редко-зас.	0,4	0,6	1,2	2,5	5,0
4	Слуцк, Рогачев, Мстиславль, Мозырь, Горки, Быхов, Климовичи и Городок	0,3	1. Торговый	—	—	8,0	16,0	25,0
			2. Торг.-жил.	0,8	1,2	4,0	8,0	16,0
			3. Жилой	0,5	0,8	2,0	4,0	8,0
			4. Редко-зас	0,3	0,5	1,0	3,0	4,0
5	Чериков, Червень, Чаусы, Сенно, Лепель	0,3						
	Жлобин, Глуск, Осиповичи, Паричи, Сураж, Костюковичи, Краснополье, Кричев, Хотимск, Койданово, Смолевичи, Смиловичи, Калинковичи, Петриков, Туров, Дубровно, Копысь, Ляды, Толочин, Дрисса и Шклов	0,2	1. Торговый	—	—	4,8	9,6	15,0
			2. Торг.-жил.	0,3	0,6	2,4	4,8	9,6
			3. Жилой	0,2	0,4	1,2	2,4	4,8
			4. Редко-зас.	0,1	0,2	0,6	1,2	2,4
6	Березина, Бобр, Черея, Бешенковичи, Лиозно, Чашники, Яновичи, Логойск, Пуховичи, Узда, Пропойск, Житковичи, Копаткевичи, Наровль, Старобин, Тимковичи и Копыль	0,2	1. Торговый	—	—	2,4	4,8	7,2
			2. Торг.-жил.	0,15	0,3	1,2	2,4	4,8
			3. Жилой	0,1	0,2	0,6	1,2	2,4
			4. Редко-зас.	0,05	0,1	0,3	0.6	1,2

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР *И. Адамович.*

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров БССР *М. Мороз.*

15 октября 1925 г.

1. Утвердить на 1924-25 б. г. для земель городов и городских поселений прилагаемую при сем табель ставок дополнительной ренты.

2. Ставки дополнительной ренты для земельных участков под торговыми, промышленными и фабрично-заводскими предприятиями и заведениями установить в размере ставок под постройками и двором одного и того же района.

3. Ставки дополнительной ренты для открытых складочных мест торгового характера установить в размере ставок определенных для земельных участков под деревянными постройками и двором данного района.

4. Разбивку земель по районам, установленным табелью ставок дополнительной ренты внутри городских поселений, поручить произвести окружным оценочным комиссиям в назначенный Наркомфином срок.

5. Разрешить окружным оценочным комиссиям в отдельных случаях и для отдельных владений повышать и понижать установленные ст. ст. 1—3 ставки дополнительной ренты, но не больше чем на 50%.

6. Предельным сроком платежа основной и дополнительной ренты за 1924-25 б. год назначить 30-е ноября 1925 года.

7. Настоящее постановление распространяется и на городские земельные участки, находящиеся в пользовании коммунальных, кооперативных и государственных хозрасчетных органов.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР *И. Адамович.*

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров *М. Мороз.*

15 октября 1925 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацыянальнае палітыкі ў галіне Народнае Асьветы ў 1925-26 навучальным годзе.

У разьвіцьцё пастановы другое сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Комітэту Саветаў БССР шостага скліку ад 15 ліпня 1925 г. (Збор. Законаў і Загадаў за 1924 год, арт. 108) аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацыянальнае палітыкі Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

А. Па соцыяльным выхаваньні.

1. Весьці выкладаньне на беларускай мове ва ўсіх працоўных школах БССР, у якіх вучацца дзеці беларускае нацыянальнасьці, на абшарах, што далучаны ў 1924 годзе—у першых трох групах, у рэшце мясцовасьцяй—ува ўсіх групах.

2. У тых сямігадовых школах, дзе ў малодшых групах беларуская мова ня выкладалася, павялічыць лік навучальных гадзін беларускае мовы да шасьці ў тыдзень.

3. Увесьці, як прадметы выкладаньня беларускую мову ва ўсіх чатырохгадовых працоўных школах усіх нацыянальнасьцяй (апроч беларускае), пачынаючы з другога году навучаньня, а расійскую мову—ва ўсіх чатырохгадовых школах усіх нацыянальнасьцяй (апроч расійскае), пачынаючы з трэцяга году навучаньня.

4. Высьвятляць насяленьню важнасьць і карыснасьць навучаньня дзяцей у роднай мове, ня ўжываючы, аднак, пры гэтым ніякіх мер прымусу.

5. Перавесьці на беларускую мову выкладаньне ў тых школах сялянскае моладзі, дзе большасьць вучняў беларускае нацыянальнасьці, і даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы распрацаваць пытаньне аб адчыненьні школы сялянскае моладзі з выкладаньнем на польскай мове.

6. Пры заснаваньні дзіцячых садоў мець на ўвазе роўнамернае абслугоўваньне ўсіх нацыянальнасьцяй.

7. Запрапанаваць Акруговым Выканаўчым Комітэтам забясьпечыць, нараўне з беларускімі школамі, адпаведнымі будынкамі ўсе іншыя школы.

8. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы адчыніць пры сямігадовых школах (польскіх і яўрэйскіх) агульныя памяшканьні для вучняў, па адным на акругу.

9. Маючы на ўвазе даражыню навучальных дапамог на нацыянальных мовах, запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы прадугледзець па каштарысе на гэта асыгнаваньні большыя за такія самыя асыгнаваньні для беларускіх ці расійскіх школ. Незалежна ад гэтага дайсьці да згоды з дзяржаўнымі выдавецтвамі УССР і РСФСР аб арганізацыі супольнага выдаваньня падручнікаў на нацыянальных мовах.

Б. Па профэсыянальна-тэхнічнай асьвеце.

1. Перавесьці цалком выкладаньне на беларускую мову ва ўсіх беларускіх пэдагогічных тэхнікумах.

2. Зьвярнуць увагу на выкладаньне беларускае мовы, а таксама гісторыі і географіі Беларусі ў польскіх і яўрэйскіх пэдагогічных тэхнікумах.

3. Увесьці ў навучальны плян Менскага Беларускага імя Ўсевалада Ігнатоўскага пэдагогічнага тэхнікуму польскую мову, як абавязковы прадмет.

4. Апрацаваць плян пераводу выкладаньня на беларускую мову ў сельска-гаспадарчых школах, распачаўшы частковае правядзеньне гэтага пляну з наступаючага 1925-26 навуч. году.

5. Перавесьці выкладаньне на беларускую мову на першым курсе рабфакаў.

6. Запрапанаваць профэсарам, доцэнтам, асыстэнтам і навуковым працаўнікам вышэйшых школ падрыхтавацца да выкладаньня і вядзеньня заняткаў са студэнтамі на беларускай мове з 1-га кастрычніка 1926 г.

7. Пры комплектаваньні вышэйшых школ студэнтамі мець на ўвазе неабходнасьць роўнамернага абслугоўваньня ўсіх нацыянальнасьцяй.

8. У тых тэхнікумах ды профшколах, дзе ёсьць значны лік вучняў аднае нацыянальнасьці, увесьці ў навучальны плян такое школы, як прадмет выкладаньня для вучняў гэтае нацыянальнасьці, родную мову.

9. Даручыць Інстытуту Беларускае Культуры ўстанавіць і выдаць аднастайную тэрмінолёгію для ўжываньня ў вышэйшых школах, тэхнікумах ды профшколах.

В. Па палітасьвеце.

1. Перавесьці цалком на беларускую мову выкладаньне ў Магілеўскай Савецка-Партыйнай Школе і часткай ў Комуністычным Унівэрсытэце БССР імя Ул. Леніна і ў Віцебскай Савецка-Партыйнай Школе другое ступені.

2. Павялічыць лік гадзін выкладаньня беларускае мовы, гісторыі ды географіі Беларусі на польскіх і яўрэйскіх аддзяленьнях партыйных школ.

3. Ліквідацыю няпісьменнасьці праводзіць на роднай мове.

4. Агітацыйныя кампаніі сярод рабочых і сялян праводзіць на іх роднай мове.

5. Весьці працу ў хатах-чытальнях, народных дамох ды клюбах на мове тае нацыянальнасьці, якую пераважна абслугоўваюць гэтыя ўстановы.

6. Пры бібліотэках, народных дамох, хатах-чытальнях, дзе значная частка насяленьня складае пэўную нацыянальную групу, адчыніць аддзяленьні, сэкцыі ці куткі для абслугоўваньня гэтае нацыянальнасьці.

7. Узмацніць рэпэртуар Беларускага Дзяржаўнага Тэатру п'есамі рэволюцыйнага зьместу і забясьпечыць п'есамі вясковы тэатр.

8. Распачаць выданьне кіно-фільмаў з рэволюцыйнага жыцьця Беларусі і дэмонстраваць усе фільмы з запісамі на беларускай мове.

9. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы, па згодзе з Народным Камісарыятам Унутраных Спраў, апрацаваць сетку курсаў для вывучэньня беларускае мовы служачымі сельскіх саветаў і раённых і акруговых савецкіх устаноў і ўвесьці гэтую сетку ў каштарыс наступнага бюджэтнага году па дзяржаўным бюджэце.

Намесьнік Старшыні Савету Народных
Камісараў БССР *С. Гэльтман.*

Час. вык. аб. Кіраўніка Спраў Савету
Народных Камісараў БССР *С. Крэндзель.*

16 верасьня 1925 г.

Абежнік Народнага Камісарыяту Асьветы БССР

аб правядзеньні нацыянальнае політыкі ў установах Галоўполітасьветы.

Акруговым Аддзелам Народнае Асьветы.

На аснове пастановы Саўнаркому БССР ад 16-га верасьня 1925 г. аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацыянальнае політыкі ў галіне народнае асьветы на 1925-26 навучальны год Галоўпалітасьветы прапануе Вам:

1. Пры з'організаваньні ліквідацыі няпісьменнасьці кіравацца прынцыпам роднае мовы і залажыць належны лік лікпунктаў на мовах нацменшасьцяй, насяляючых гэтыя мясцовасьці. Да гэтага часу ў гэтай галіне заўважваецца шмат недахопаў, на мясцох часта не даацэньваюць важнасьць ліквідацыі няпісьменнасьці на роднай мове; часта няпісьменным лічуць кожнага, ня ведаючага расійскай мовы (Магілеў, Калінінск).

2. Прыслаць дэтальную сетку Політасьветустаноў нацменаў, якая будзе існаваць у 1925-26 годзе.

3. Трэба ўстанавіць асабовы падлік політасьветпрацы на нацыянальных мовах, на што мае быць з самага пачатку зварочана найбольшая ўвага.

4. Пры бібліотэках, нардамох, хатах-чытальнях, дзе значная частка насяленьня складае пэўную нацыянальную групу, адчыніць аддзяленьні, сэкцыі, ці куткі дзеля абслугоўваньня гэтае нацыянальнасьці.

5. З сродкаў, якія асыгнуюцца з мясцовага бюджэту для літаратуры ў хатах-чытальнях, нардамох, клюбах, бібліотэках, Акрполітасьветы павінны ў належнай меры забясьпечыць таксама і нацлітаратурай. Гэта трэба мець на ўвазе пры кожнай закупцы літаратуры.

6. Аб усіх вышэйвызначаных пытаньнях Акрполітасьветы павінны даць адпаведныя распараджэньні ў раёны і з свайго боку даваць зьвесткі аб працы сярод нацменшасьцяй у квартальных справаздачах.

Нам. Народнага Камісара Асьветы БССР *Баліцкі.*

Старшыня Галоўпалітасьветы *Бялуга.*

Кіраўнік спраў *Красінскі.*

19 лістапада 1925 г.
№ 100.

Абежнік Народнага Камісарыяту Асьветы БССР.

Аб правядзеньні перапісу школ і інш. культурна-асьветных устаноў на тэрыторыі БССР.

Акруговым Аддзелам Народнае Асьветы. Копія Цэнтральнай Статыстычнай Управе.

У сьнежні месяцы 1925 году на тэрыторыі БССР адбудзецца агульны перапіс школ і іншых культурна-асьветных установ, ня гледзячы на тое, каму яны падпарадкаваны.

Агульнае кіраўніцтва над перапісам належыць да Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы Беларусі. Організацыйная праца па перапісе, а таксама і нагляд за працай даручаецца Акруговым Статыстычным Бюро, а на Акруговыя Аддзелы Народнае Асьветы і Раённыя Культаддзелы ўскладаецца адказнасьць за своечасную дастаўку матэрыялаў і правільнасьць вестак, якія імі даюцца.

Усе матэрыялы па перапісе ў раёнах зьбіраюцца загадчыкамі Раённых Культаддзелаў і, разам з адпаведным сьпісам усіх школ і іншых культурна-асьветных устаноў раёну, пасылаюцца ў Акруговае Статыстычнае Бюро ў вызначаны тэрмін.

Дадатак: Наказ Цэнтральнага Статыстычнага Бюро.

Нам. Народнага Камісара Асьветы БССР *Баліцкі.*

Кіраўнік Спраў *Красінскі*

12 лістапада 1925 г.
№ 96.

Дадатак.

Кароткі наказ да перапісу ўсіх школ і іншых культурна-асьветных устаноў на 1-ае сьнежня 1925 г.

Чарговы статыстычны досьлед усіх школ і іншых культурна-асьветных устаноў БССР павінен адбыцца, згодна загаду Цэнтру, у тэрміновым парадку, дзеля таго што да 1-га сакавіка 1926 году новыя весткі па аддзелу статыстыкі Народнае Асьветы павіны быць ужо апублікованы.

У зьвязку з гэтым Цэнтральная Статыстычная Ўправа Беларусі, праводзячы гэтую працу ў цеснай сувязі з НКА, прапануе як Акруговым Статыстычным Бюро, так і Акруговым Аддзелам Народнае Асьветы строга кіравацца на наступны каляндарны плян перапісу:

1) Пытальныя блянкі павінны быць разьмеркаваны па Раённых Выканаўчых Комітэтах (адначасна з загадам Акр. АНА) не пазьней 1-га сьнежня.

2) Загадчыкі Раённых Культаддзелаў павінны даручыць гэтыя бланкі ўсім Загадчыкам школ і іншых культурна-асьветных установ свайго раёну да 10 сьнежня.

3) Загадчыкі школ і іншых культасьветных установ, па запаўненьні бланкаў вычэрпнымі адказамі на ўсе пастаўленыя пытаньні, павінны зьвярнуць іх тэрмінова Загадчыкам Райкультаддзелаў.

4) Загадчыкі Раённых Культаддзелаў, якія нясуць адказнасьць за паўнату (100 проц. установ), своечаснасьць паступленьня, а таксама і якасьць атрыманых статыстычных матэрыялаў, маюць права, дзеля таго, каб спраўдзіць гэтыя матэрыялы, затрымаць іх у сябе на два-тры дні, але з тым, каб увесь статыстычны матэрыял па іх раёне, разам з адпаведным сьпісам усіх школ і іншых культасьветных установ раёну, быў адаслан у Акруговае Статыстычнае Бюро 20-25 сьнежня.

5) Калі пры запаўненьні бланкаў будзе што-колечы незразумела, дык за тлумачэньнм належыць зварачвацца да мясцовых Акруговых Статыстычных Бюро

Загадчык Аддзелу Статыстыкі
Нарасьветы ЦСУ БССР *Б. Обух.*

Абежнік Народнага Камісарыяту Асьветы БССР.

Аб парадку адчыненьня дагаворных школ.

Акруговым Аддзелам Народнае Асьветы, копіі Савету Народных Камісараў, Дзяржаўнай Плянавай Комісіі, Савету Профэсыянальных Саюзаў, Цэнтральнай Управе Саюзу Працаўнікоў Асьветы.

Ня гледзячы на тое, што на бягучы 1925-26 навучальны год, у параўнаньні з мінулым годам, школьная сетка вясковых чатырохгадовых школ значна пашырана і ўсе існаваўшыя дагаворныя школы ўнесены ў агульную школьную сетку і ўтрыманьне іх унесена ў каштарыс па мясцовым бюджэту, усё-ж такі сетка гэтая не нагэтулькі шырокая, каб школа магла здаволіць усе патрэбы вясковага жыхарства, і, бязумоўна, будуць выпадкі, што жыхарства будзе хадайнічаць аб выдачы яму дазволу на адчыненьне дагаворных школ на яго ўтрыманьні, і па меры патрэбы і мажлівасьці дазволы гэтыя трэба будзе даваць.

Адчыненьне дагаворных школ можа быць дапушчана толькі пры ўмовах, калі жыхарства абавязуецца ўсё ўтрыманьне гэтых школ узяць на сябе да тэй пары, пакуль тая ці іншая школа ня будзе ўведзена ў агульную сетку і ўтрыманьне яе ня будзе праведзена па бюджэту.

Паводле вышэйпісанага і на грунце пастановы Колегіі НКА (протокол ад 16 лістапада 1925 г. № 14, п. 2) прапануецца пры адчыненьні дагаворных школ кіравацца наступным:

1) Дазвол сялянам на адчыненьне дагаворных школ на іх самаўтрыманьні даецца Раённым Выканаўчым Комітэтам, які, з свайго боку, павінен папярэдзіць жадаючых адчыніць школу, што адчыненьне тэй ці іншай школы не азначае ўключэньне яе ў наступным годзе ў дзяржаўную сетку, і што школу гэтую сяляне павінны будуць утрымліваць на свой кошт да тэй пары, пакуль яна ня будзе ўключана ў бюджэт.

2) У дагаворных школах заняткі павінны будуць весьціся па програмах НКА пад наглядам і контролем Раённага Выканаўчага Комітэту і акруговых інспэктароў па народнай асьвеце.

3) Настаўнікі ў гэтыя школы запрашаюцца самым сялянствам за плату, з імі ўмоўленую, але зацьвярджае іх РВК.

4) Пры адчыненьні дагаворных школ павінна быць зроблена ўмова сельсаветам з упоўнаважанымі бацькоў вучняў, згодна далучаемага да гэтага ўзору, першатвор якой перасылаецца ў РВК, а копіі павінны быць у сялян, школе і Сельсавеце.

5) У кожным разе пры адчыненьні тэй ці іншай дагаворнай школы абавязкова павінна даводзіцца праз РВК да ведама Акр. АНА, які ў сваю чаргу павінен сьпіс дагаворных школ прыслаць у НКА, з адзначэньнем у гэтым сьпісе пунктаў і адрасоў гэтых школ.

6) Пры адчыненьні таксама трэба зьвярнуць увагу і на тое, каб школа, якая адчыняецца, мела больш-менш адпаведны будынак і крайне патрэбнае для школы абсталяваньне.

Нам. Народнага Камісара Асьветы БССР *Валасевіч.*

Заг. Галоўсоцвыху *Каранеўскі.*

Кіраўнік Спраў *Савіч.*

4 лістапада 1925 г.
№ 109.

Дадатак.

УМОВА.

192......году..Мы, ніжэйпадпісаныя, з аднаго боку, упоўнаважаныя ад грамадзян..вёскі.................................... сельсавету..раёну..акругі паводле пастановы агульнага сходу сялян (протокол ад..192......г. №..................), з другога боку, старшыня..Райвыканкому.............. ....акругі зрабілі гэтую ўмову згодна наступнага:

1. а) Мы, разам з упоўнаважыўшымі нас грамадзянамі вёскі і сельсавету, абязуемся для адчыненьня намі.. школы наняць адпаведны будынак, наняць настаўніка, здабыць неабходнае абсталяваньне і навучальныя дапамогі, а таксама бяром на сябе ўсё ўтрыманьне гэтае школы да таго часу, пакуль утрыманьне яе ня будзе пераведзена на бюджэт.

б) Згаджаемся на тое, каб усё навучаньне ў гэтай школе вялося па пляну і програмах НКА і каб нагляд і контроль за гэтаю школаю быў з боку РВК і Акруговага Інспэктара па народнай асьвеце, а таксама ў выпадку зачыненьня гэтае школы ўся маёмасьць яе, як вучэбныя дапамогі, кнігі і абсталяваньне, пераходзіць у распараджэньне органаў Народнага Камісарыяту Асьветы.

2. Старшыня..РВК-ту..акругі

Даю гэтым дазвол на адчыненьне..школы і абавязуюся аб адчыненьні яе паведаміць Акруговы Аддзел Народнае Асьветы, дзеля таго, каб ён меў свой нагляд за гэтаю школаю.

Упоўнаважаныя ад грамадзян (подпісы).

Старшыня сельсавету (подпіс).



Наказ Народнага Камісарыяту Асьветы БССР па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў і пераменьнікаў тэрыторыяльных часьцін БССР.

1. На моцы наказу СНК БССР па прыстасаваньні пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР ад 8 жніўня 1924 г. аб ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў і чырвонаармейцаў пераменнага складу тэрыторыяльных часьцін, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў і пераменьнікаў праводзіцца ў абавязковым парадку.

2. Няпісьменнымі лічацца дапрызыўнікі і пераменьнікі тэрыторыяльных часьцін: а) якія ня ўмеюць ні чытаць, ні пісаць; б) якія ўмеюць чытаць, але ня пішуць альбо ня ведаюць першых двух арытмэтычных дзеяньняў; в) якія ўмеюць чытаць і пісаць, але настолькі слаба, што зусільлі над тэхнікай чытаньня не дазваляюць зразумець сэнсу таго, аб чым чытае, а зусільлі над тэхнікай пісьма не дазваляюць выкладаць сваю думку на паперы.

3. Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў і чырвонаармейцаў пераменнага складу тэрыторыяльных часьцін праводзіцца на роднай мове. Для гэтай мэты, апрача пунктаў на беларускай мове, у мясцох з пераважным жыхарствам другой, не беларускай нацыянальнасьці, адчыняюцца спэцыяльныя лікпункты на мовах гэтае нацыянальнасьці.

1. Обратить внимание на подбор медицинского персонала.
2. Усилить работу по укоренению санитарного и гигиенического просвещения в деревне.
3. Провести в округе санитарный осмотр колодцев и жилищ.
4. Позаботиться расширением в будущем году сети полевых яслей в деревнях.

Торговля и кооперация.

Число потребительских обществ за отчетный год возрасло на 30,8%, увеличение пайщиков произошло на 59 %, паевой капитал увеличился на 395%. Из общей суммы проданных товаров 46,7% падает на долю пайщиков и 53% другим лицам. В среднем на одного пайщика приходится 38 р. 46 к. Личный состав работников кооперации вместе с общим укреплением финансово-экономической мощности низовой сети, значительно улучшился и возрос количественно. Общее количество работников кооперации на 1 сентября 1925 г. выражается в 351 единице, из них 42 женщины. Работа Райсоюза по заготове зерновых, мясных и прочих продуктов за отчетный год выражается в заготовке на сумму 435977 р.

Количество торговых предприятий ЦРК в отчетный период возросло до 17. Пайщиков ЦРК состоит на 5/X-1925 г. 1730 человек против 1389 ч. в октябре 1924 года. Товарный оборот ЦРК выражается в следующих цифрах: закуплено товаров за год на первое октября 1925 г. в сумме 931,261 р., продано товаров на сумму 1,085,522 р. В ведении ЦРК находятся следующие производственные предприятия: одна хлебопекарня, две столовых и одна сапожная мастерская. Финансовое состояние ЦРК определяется следующими данными: основной капитал на 1/VII-1925 г. равняется 33677 р. паевой капитал 3363 р. В отчетный период организован центральный детский кооператив, насчитывающий свыше 500 пайщиков детей. Организован кооперативный уголок в полку.

Слуцкое отделение Госторга за отчетный период заготовило разного экспортного сырья на сумму 218996 р., получено импортного товару на сумму 76808 руб. По сравнению с 1924 годом заготовка увеличена больше, чем в два раза, а по сравнению с 1923 годом почти в 6 раз и прогрессирует из года в год, как по количеству заготовок старых видов экспортного сырья, так и по изысканию новых видов.

Судебные органы и милиция.

На первое октября 1925 года штат Милиции и Уголовного Розыска состоял из 131 человека. По партийности: членов КПБ и КСМ 30 человек, 101 беспартийных, по социальному положению крестьян 114, рабочих 6, служащих 5 и прочих 6. Деятельность Милиции и Уголовного Розыска на первое октября 1925 г. по борьбе с разного рода преступностью выражается в следующем: заявлено случаев преступлений 3405, из них раскрыто 2391. Всего задержано было: за провоз и перенос контрабанды—12, бандитов и воров—84, военных дезертиров—8 и при производстве облав—138. Заведено дел по привлечению к ответственности в судебном порядке—335 и в административном 1279. Наложено штрафу за самогонку 11.816 р., из коих 8201 руб. уже взысканы.

За отчетный год прокуратурой принято разных жалоб и заявлений 783, из них направлено судебным органам для привлечения к ответственности виновных 235, для производства следствий 46, разрешено иным путем 441 и оставлено без последствий 101. За отчетный год поступило законченных дознанием дел 695, из них прекращено 110, 275 дел направлено следователям, 167—направлено в Высший суд Республики, 397 направлено в нарсуд с постановлениями о предании суду, 51 дело направлено в нарсуд на прекращение, 21 для разрешения в административном порядке и т. д.; осталось неоконченных на 1 октября 1925 года 44 дела.

Почта и телеграф.

К концу отчетного года в округе сеть почтово-телеграфных учреждений выражается в следующем: почтово-телеграфных учреждений 11, почтовых—5 и 8 вспомогательных пунктов.

В отчетное время организована кольцевая почта по 12 кольцевым передвижным трактам, протяжением 814½ километров. Кольцевой почтой обслуживалось непосредственно 164 населенных пункта. Учреждения связи в отчетном году дали дохода 35.817 руб. по сравнению с 25205 руб. прошлого года. Расход по учреждениям выразился в сумме 21255 р. в 1925 году по сравнению с 19818 р. в 1924 г.

Социальное страхование.

Всех средств по страховой кассе за отчетный период поступило 176.923 руб. В отчетный период послано на курорт 32 человека, из них рабочих 21, 9 служащих и 2 иждивенца. Курортная кампания обошлась в 10000 р.

Физкультура.

Всего физкультурой охвачено 1706 человек, из них 116 женщин, 430 мужчин и 1160 пионеров. В количественном отношении против 1924 года имеется увеличение на 1210 человек. Из числа 1706 человек, обслуживаемых физкультурой падает на город 556 и по районам—Старо-Дорожский—125, Гресский—245, Любаньский—20, Копыльский—30, Красно-Слободский—105, Старобинский—270 и Слуцкий—85. Во всех районах организованы районные советы физкультуры, а также кружки физкультуры. Необходимо отметить возрастающий интерес рабоче-крестьянской молодежи к физкультуре, за счет которых имеется количественное увеличение обслуживаемых.

Основными моментами работы на будущий год Окрисполком считает в области социального обеспечения и крестьянской взаимопомощи:

1. Ввести точный учет всех видов оказываемой социальной помощи.

2. Принять активное участие помощи безлошадным, вдовам и сиротам.

3. Провести кампанию по перевыборам крестьянских комитетов, привлекая в них сельский актив и передовых крестьянок.

4. Провести общий учет по округу фондов и имущества крестьянских комитов.

5. Принять меры к полному кооперированию инвалидов.

В области государственного кредита.

1. Провести в жизнь постановление центра о реформе классового упорядочения округов.

2. Принять меры к привлечению свободных денежных средств в кассу госбанка.

3. Стремиться к большему привлечению денежных излишков крестьянства в трудовые сберегательные кассы.

По сельско-хозяйственному кредиту.

1. Распределить сумму 832.000 р., полученную по плану, с каковой на долгосрочный кредит 26,8 проц. и на краткосрочный—73,2 проц.

2. Добиваться получения от Белсельбанка дополнительной суммы свыше плана до 1.000.000 р.

3. Увеличить кредитную сеть в округе до 15 кредитных товариществ.

4. Принять меры к усилению привлечения крестьян пайщиками кредитных сел-хоз. организаций.

По судебному делу.

1. Усилить и расширить работу по проведению в жизнь революционной законности.

2. Заслушать по очереди доклады всех Народных Судей на заседании Президиума Окрисполкома.

3. Наблюдать за своевременным проведением в жизнь судебных решений и приговоров.

4. Признать необходимым рассматривать более характерные дела уголовного значения на месте совершения преступления и вообще практиковать выезды народных судов в более отдаленные сельсоветы районов.

5. Принять меры к поднятию политического уровня милиционеров.

6. Наблюдать за более аккуратным отношением сельских исполнителей к своим обязанностям.

7. Усилить надзор за несением ночного караула в сельских местностях.

8. Принять меры к неослабному надзору за исполнением населением обязательных постановлений.

По народной связи.

1. Упорядочить телефонную сетку в округе.

2. Расширить движение кольцевых почт.

3. Разработать проекты введения института письмоносцев.

4. Охватить обслуживанием присоединенные от Мозырского Округа местности.

По страхованию.

1. Поднять вопрос перед центром о введении обязательного страхования лошадей.

2. Принять меры к скорейшей выплате страховых премий в случаях пожаров, падежа и градобития.

3. Принять меры к полной ликвидации недоимок по страхованию и страховым платежам.

По торговле и кооперации.

1. Глубоко изучить положение всех видов кооперации и торговли и степень выполнения заготовок.

2. Стремиться осуществить выработанные Райсоюзом и Сельсоюзом планы: по кооперированию населения и развитию кооперативной сети.

На основе указанных моментов в работе на будущий год, Окрисполком поручил всем отделам и хозяйственным органам к началу каждого квартала разработать продуктивные планы и внести на рассмотрение и утверждение Президиума Окрисполкома.

Справаздача Чырвона-Слабодзкага Раённага Выканаўчага Комітэту Слуцкае Акругі.

За пэрыод з красавіка па кастрычнік 1925 году.

Стан апарату РВК і сельсаветаў.

За справаздачны пэрыод у Раённым Выканаўчым Комітэце адбылося 23 пасяджэньні, на якіх разгледжана 396 пытаньняў; пленарных пасяджэньняў з удзелам сельсаветаў было пяць. Зямельнымі справамі і Раённым Комітэтам узаемадапамогі загадваюць сяляне, якія высунуты непасрэдна ад сахі. Пры РВК існуюць наступныя сэкцыі: сельскагаспадарчы савет, коопэрацыйная нарада, лясная комісія, падатковая, дарожная, політасьветная, пажарная і савет фізычнае культуры. Усе гэтыя комісіі працаздольныя і вынікі іх працы здавальняючыя.

Сельсаветы раёну маюць 156 сяброў, у тым ліку: сялян—141, батракоў—3, служачых—7 і інтэлігентаў—5; па партыйнасьці: сяброў і кандыдатаў КПБ—15, комсамольцаў—8, беспартыйных—133, жанчын—18. Комісіі пры сельсаветах працуюць ня стала, а сэзонамі. Працаю комісій і вясковых організацый сельсаветы кіруюць слаба. РВК кіраваў працаю сельсаветаў праз пленумы, выездамі на месцы і інструкцыйнымі нарадамі. У лістападзе былі організаваны курсы для працаўнікоў вясковых органаў. Для канчатковага пераводу органаў на беларускую мову ў раёне таксама організаваны курсы. Беларусізацыя ў школах праведзена цалком.

Эканомічнае становішча раёну.

У галіне зямляўпарадкаваньня праведзена наступнае: зямляўпарадкавана плошча ў разьмеры 2047 дзес., пабудована 6 новых пасёлкаў, у якіх ужываецца чатырохпольле. Гаспадаркі раёну па забясьпечанасьці зямлёю дзеляцца на: малазямельныя—5,2 проц., ад 2 да 5 дзес.—65,5 проц. і звыш. 5 дзес.—29,3 проц. Жывёлы за гэты год у раёне павялічылася на 10 проц. Становішча савецкіх гаспадарак паляпшаецца, адчуваецца толькі недахоп сродкаў і адсутнасьць рамонтных майстэрняў, куды-б сяляне маглі зварачвацца для рамонту сельск.-гасп. прылад.

Агульная плошча лесу ў раёне—16,120 дзесяцін, з іх пад лесам—14.105 дзес., пахаты і сенажаці—1.403 дзес., і высечанае плошчы—612 дзес. Лясоў мясцовага значэньня, якія перададзены сялянам, налічваецца 1.360 дзес.

За справаздачны пэрыод адпучшана сельсаветам 480 пнёў на дарожнае будаваньне. Пабудован 1 вялікі мост і 24 малых.

Саматужная прамысловасьць значна пашырылася ў зьвязку з памяншэньнем падаткаў саматужнікаў. Галоўныя саматужныя прадпрыемствы ў раёне—гэта кузьні, млыны і іншыя.

Прыходна-расходны каштырыс выканан на 105 проц. Галоўныя паступленьні даходаў складаюць штрафы, якія ў гэтым годзе далі 900 р. У параўнаньні з мінулым годам сельск.-гасп. падатак паменшыўся на 55 проц.

Скаргаў на няправільнае ўзысканьне падаткаў было ў гэтым годзе 489, у той час як у леташнім годзе іх было 1.469. Дадзена льгот сем'ям чырвонаармейцаў—1.657, незаможным гаспадаркам—324 і адмоўлена—181. Каштарыс на новы год падрыхтован; даход раёну павялічыўся, дзякуючы павялічэньню эксплёатацыі садова-гародняе гаспадаркі. Даход раёну ў гэтым годзе вызначаецца ў разьмеры 43.973 руб. расход—93.000 руб.

Народная асьвета.

У мінулым годзе ў раёне лічылася 27 пачатковых школ і 3 сямёхгодкі; у гэтым годзе лічыцца 26 школ і 1 сямёхгодка. Дзяржаўнымі будынкамі забясьпечана 43 школы, а 4 памяшканьні для школ прыходзіцца наймаць. Апрача гэтага, будуюцца новыя тры школы. Падручнікамі школы ў раёне забясьпечаны ў гэтым годзе на 55 проц.; закуплена падручнікаў на беларускай мове на 1000 р., у раёне ёсьць народны дом, хаты-чытальні і 39 розных гурткоў.

Коопэрацыя.

Лік пайшчыкаў у коопэрацыі павялічыўся на 23 проц., коопэравана 50 проц. усіх двароў. Спажывецкая коопэрацыя ахапляе 60 проц. рынку, сельска-гаспадарчая—20 проц. і прыватны гандаль—20 проц. У рабоце коопэрацыі ёсьць недахопы: няма плянавасьці, ёсьць залежалыя тавары і вялікія накладныя расходы. Галоўныя недахопы коопэрацыі ў тым, што яна мала абслугоўвае патрэбы сельскае гаспадаркі—больш у ёй гандлёвых опэрацый (збыт сырызны).

Пошта ў раёне—дэфіцытная, што тлумачыцца ўтрыманьнем кальцавое пошты, якая ўсё-ж такі для сялян патрэбна.

Грамадзкія ўстановы, як Авіяхім, ліквідацыя няпісьменнасьці, у раёне працуюць слаба.

Сувязь з акругаю здавальняючая.

З дакладу Межынскага Раённага Выканаўчага Комітэту Віцебскай акругі аб яго дзейнасьці.

На пасяджэньні Прэзыдыуму Віцебскага АВК з удзелам старшынь Раённых Выканаўчых Комітэтаў разам з іншымі пытаньнямі быў заслухан даклад Межынскага РВК аб яго дзейнасьці.

Галоўныя моманты дакладу наступныя.

Палітычнае становішча раёну здавальняючае. Працадзольнасьць апарату РВК таксама здавальняючая. Беларусізацыя апарату паступова

пачынае праводзіцца, пры сельсаветах і пры раённым выканаўчым комітэце існуюць гурткі беларускай мовы.

Кампанія па вучоту об'ектаў абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам у гэтым годзе па раёне прашла здавальняюча. Выяўлена значная плошча захованай ад вучоту зямлі. Скаргаў і заяў па сельска-гаспадарчаму падатку ўсяго паступіла 2225, па якіх складзена сельска-гаспадарчага падатку 5.023 рублі.

Прамысловасьць у раёне разьвіта слаба. Фабрык і заводоў няма. Усю прамысловасьць складаюць, галоўным чынам, саматужныя прадпремствы, з якіх галоўныя: млыны і рыбныя гаспадаркі.

Масты і дарогі мясцовага значэньня ў раёне знаходзяцца ў дрэнным стане.

Сельскіх гаспадарак у раёне налічваецца 5.474, колектыўных—5 і 1 комуна. Колектыўныя гаспадаркі знаходзяцца не на адпаведнай вышыні. Некаторыя з іх перашлі на шматпольле.

Зямляўпарадкаваньне ў раёне праводзіцца добра. Агрономічная праца вядецца ня зусім добра з тэй прычыны, што няма належнага кіраваньня апаратам.

У гэтым навучальным годзе ў Межанскім раёне будуць працаваць 37 школ пачатковых, з якіх 32 аднакамплектных, 4—двухкамплектных і адна сямёхгодка. Хат-чытальняў у раёне лічыцца 3 сеткавых і 2 нясеткавых, апрача гэтага, маецца на ўвазе адчыніць у кожным сельсавеце падраённыя хаты-чытальні.

У раёне маецца два лячэбных пункты, з якіх—адна больніца і адзін лекарскі пункт.

Спэцыяльных установ па соцыяльным забясьпечаньні ў раёне няма, апрача раённага комітэту ўзаемадапамогі, пры якім існуе комісія па вучоту інвалідаў вайны. У кожным сельсавеце таксама ёсьць комітэты ўзаемадапамогі. У эксплёатацыі раённага комітэту ўзаемадапамогі знаходзіцца адзін паравы млын, а ў адным з сельскіх саветаў—адна кузьня з 4-ма рабочымі. Раённы комітэт узаемадапамогі мае пракатны пункт, на якім працуюць 2 малатарні і іншыя сельска-гаспадарчыя прылады.

Па дакладу Прэзыдыум Віцебскага АВК пастанавіў:

1) Зьвярнуць увагу раённага выканаўчага комітэту на падняцьце працаздольнасьці комісій пры сельскіх саветах, комітэтаў узаемадапамогі, пленумаў сельскіх саветаў і г. д.

2) Лічыць, што процант коопэраванага насельніцтва па раёну вельмі нізкі, а таму раённаму выканаўчаму комітэту прыняць меры к уцягненьню большага ліку насельніцтва як у спажывецкую, так і сельска-гаспадарчую коопэрацыю.

3) Сельсаюзу канчаткова адмежаваць функцыі паміж спажывецкай і с.-гаспадарчай коопэрацыяй; адначасна з гэтым прыступіць к організацыі новых саматужна-вытворчых арцеляй.

4) Адзначаючы, што лік школьных будынкаў у раёне меншы, чым у іншых раёнах, прапанована акруговаму фінансаваму аддзелу пры разьмеркаваньні сродкаў на школьнае будаўніцтва па акрузе вызначыць большы процант Межанскаму раёну.

5) Аддзелу комунальнай гаспадаркі прапанована пры складаньні пляну на грамадзкія работы наступнага году вывучыць пытаньне аб уключэньні рамонту палатна дарогі Межа—Бычыха. Апрача гэтага, выдзеліць больш сродкаў на дарожнае будаўніцтва для Межынскага раёну.

6) Зьвярнуць галоўную ўвагу раённага выканаўчага комітэту на агрономічную работу ў раёне, а таксама на беларусізацыю савецкага апарату.

7) З прычыны таго, што зысканы процант страховых плацяжоў у раёне нязначны і, у параўнаньні з іншымі раёнамі, зысканьне іх нездавальняючае—раённаму выканаўчаму комітэту даручана ў самы кароткі тэрмін узмацніць зысканьне гэтых плацяжоў.

З дакладу аб працы Горкаўскага сельсавету Чэрыкаўскага раёну Калінінскай акругі за пэрыод студзень—верасень 1925 г.

Агульнае становішча

Горкаўскі (Губішчанскі) сельскі савет знаходзіцца ў в. Губішчыне ў адлегласьці ад раёнага цэнтру, м. Чэрыкава, 15 вёрст і аб'яднае 11 населеных пунктаў з агульным лікам насельніцтва 3.405 чалавек. Насельнітцва сельсавету займаецца выключна земляробствам; прамысловасьці на абшары сельсавету ніякай няма. Усіх гаспадарак налічваецца 581, пахатнай зямлі—2.729,7 дзесяцін, сенажаці—398,4 дзес., буйной рагатай жывёлы—977 галоў, коняй—772.

Палітычнае становішча і адносіны насельніцтва да Савецкай улады здавальняючыя; асабліва сялянства здаволена зьніжэньнем с-г. падатку.

Стан апарату сельскага савету і яго працы.

Сельскі савет складаецца з 16 сяброў, з каторых—15 мужчын і 1 жанчына. Па партыйнасьці—сяброў КСМ 2 і астатнія беспартыйныя. Пасаду старшыні с-.савету займае член КСМ. Уся праца с.-савету праходзіла па распрацаванаму пляну і выканана толькі на 50 проц., што тлумачыцца малою ініцыятывай с.-савету, пасыўнасьцю некаторых членаў с.-савету і г. д. Работа с.-савету, галоўным чынам, вызначалася ў выкананьні пастаноў і загадаў вышэйшых органаў.

За справаздачны пэрыод пасяджэньняў с.-савету было 5; пленумаў с.-савету—5. На пленумах, галоўным чынам, былі заслуханы справаздачы: сельска-гасп. таварыства, школьных працаўнікоў і інш. Выездаў на вёскі для правядзеньня пленумаў ці пасяджэньняў с.-саветам не рабілася. Пры с.-с. організаваны 2 комісіі: сельска-гаспадарчая і культурнаасьветная. Праца гэтых комісій слабая з прычыны пасыўнасьці іх членаў. Сялянскі актыў с.-саветам таксама не скарыстаны і поўнасьцю ня выяўлен. Належнага кіраўніцтва працаю ўсіх організацый, якія знаходзяцца на абшары с.-савету, з боку апошняга ня было. Дзелаводзтва ў с.-савеце пераведзена на бел. мову. Сакратаром с.-савету пройдзены 2-х тыднёвыя курсы па беларусазнаўству.

Зямляўпарадкаваньне.

Усіх зямляўпарадкаваных двароў на абшары сельсавету лічыцца ў 3-х пасёлках. К далейшаму зямляўпарадкаваньню намечана некалькі вёсак. Абрэзка поўпрацоўных гаспадарак спынена ў сувязі з намечаным зямляўпарадкаваньнем. Форма зямлякарыстаньня пераважна трохпольная; таксама ўжываецца ў некаторых выпадках травасеяньне, мінэральнае ўгнаеньне і г. д. У вёсках адчуваецца вялікая патрэба ў сенажаці, забясьпечанасьць якою савецкіх гаспадарак таксама слабая. Агрономічная пропаганда праводзіцца раённым агрономічным пэрсоналам

Комунальнае будаўніцтва.

Становішча шляхоў і вясковых дарог на абшары с.-с. здавальняючае, за выключэньнем Горкаўскага шляху для рамонту якога у распараджэньні с.-савету няма сродкаў, а насельніцтва прыняць удзел у гэтай справе адмаўляецца.

У пажарных адносінах становішча с.-савету таксама здавальняючае; пажараў за гэты год амаль што ня было. Пры с.-савеце арганізавана паж. дружына з аддзяленьнямі ў кожнай вёсцы с.-савету. Пажарны інвэнтар складаецца з 12 бочак, 27 багроў і 12 лесак; маецца на ўвазе атрымаць ад Чэрыкаўскай паж. дружыны машыны.

Народная асьвета.

На абшары с.-савету знаходзіцца 3 школы, з каторых 2 знаходзяцца ў прыватных памяшканьнях, што ня зусім адпавядае свайму назначэньню з прычыны таго, што гэтыя памяшканьні малыя і не прыстасованы для школ. Для поўнага ахопу дзяцей школьнага ўзросту патрабуецца 2 школы. Усіх дзяцей школьнага ўзросту налічваецца 408, з якіх хадзіла ў школу 200. Зацікаўленасьць як насельніцтва, так і дзяцей к асьвеце вялікая. Інвэнтаром, падручнікамі, апалам і інш. школы забясьпечаны на 50 проц. Настаўніцтва ў школах працаздольнае і прымае ўдзел у грамадзкай працы.

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослых праходзіць слаба: з 101 няпісьменнага праз лікпункт прапушчана толькі 19 асоб. У раёне с.-савету ёсьць 4 хаты-чытальні, праца ў якіх у летні пэрыод праходзіць слаба; адчуваецца адсутнасьць літаратуры, галоўным чынам, сельска-гаспадарчай. Па с.-савету выпісваецца 60 розных газэт.

Соцыяльная забясьпека.

Точнага вучоту колькасьці членаў комітэту няма з прычыны таго, што яшчэ не ажыцьцёўлена поўнасьцю добраахвотнае сяброўства. Комітэт мае ў пасэсіі сад і мае фонду: 335 пудоў збожжа і 134 руб. грошай. З гэтага фонду 285 пудоў аддадзена ў пазыку сялянству на абсемяненьнене. Дапамога бедняком, сем'ям чырвонаармейцаў і г. д. робіцца, і наогул ініцыятыва і зацікаўленасьць у працы сельскага комітэту маецца, адно толькі дрэнна, што з боку вышэйшых ўстаноў няма належнага кіраўніцтва і шчыльнай сувязі. Дзелаводзтва і рахунковасьць пастаўлены кепска, што ў большай часьці трэба аднесьці к віне рэвізыйнай комісіі.

У раёне працуе Горкаўскае сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва, праца якога праходзіць значна і коопэравана болей 500 асоб сялянства аднаго Горкаўскага сельсавету з ліку 582 гаспадарак.

Па акругах.

I. Зямляўпарадкаваньне.

I. 2 лістапада гэтага году на пасяджэньні пленуму *Магілёўскага Выканаўчага Комітэту* быў заслухан плян працы акруговага зямельнага аддзелу на 1926 год.

Адзначыўшы працу Зямельнага Аддзелу, выкананую на 120 проц. нагрузкі па ўнутрыпаселішчнаму зямляўпарадкаваньню і зямлянадзяленьню, пленум пастанавіў правясьці наступныя мерапрыемствы:

а) у першаю чаргу правясьці зямляўпарадкаваньне ў вёсках з больш запутанымі зямельнымі адносінамі;

б) разьмяркоўваць у першую чаргу запасныя зямельныя фонды, якія перададзены з ляснога фонду і дзяржаўных зямельных маемасьцяй, паміж безьзямельнымі і малазямельнымі сялянамі;

в) пацьвердзіць раённым выканаўчым комітэтам неабходнасьць бязумоўнага выкананьня пастановы СНК БССР ад 6/VI—1925 году ў адносінах абрэзкі;

г) даручыць раённывм выканаўчым комітэтам пераглядзець дзяржаўны лугавы фонд, і ўсе вучасткі, якія нерададзены ў парадку зямляўпарадкаваньня, перадаць у сталае карыстаньне сялянству;

д) прапанаваць раённым выканаўчым комітэтам прыняць рашучыя меры к зысканьню нядоімак па зямляўпарадкаваньню;

е) організаваць працу па забываньні торпу на заводзе „Котуш" і організаваць пры ім пункт па культуртэхніцы забалочаных лугоў;

ж) зьвярнуць увагу Народнага Камісарыяту Земляробства на нямэтазгоднасьць спосабу здачы падраду па мэліорацыі ў Народным Камісарыяце Земляробства;

з) лічыць неабходным організаваць паказальныя вучасткі на лугох мэліорацыйных таварыстваў;

і) Акруговаму зямельнаму аддзелу і раённым выканаўчым комітэтам даручана ўвясьці шматпольле ў новых пасёлках і больш увязаць працу з Сельсаюзам па лініі організацыі новых колектыўных гаспадарак, малочных і іншых таварыстваў;

к) зьвярнуць асаблівую ўвагу на організацыю сеткі паказальных вучасткаў па льнаводзтву і на організацыю арцеляй па апрацоўцы льну;

л) пашырыць сетку злучных пунктаў і плошчу пладовых пітомнікаў.

Па частцы лясной гаспадаркі пленум пастанавіў:

а) перадачу лясоў мясцовага значэньня скончыць у працягу лістапада г. г.;

б) узмацніць ахову лясоў дзяржаўнага фонду і прыняць рашучыя меры для барацьбы з ляснымі нарушэньнямі;

в) зрабіць рамонт насенных сушылак і пабудаваць новыя ў тых лясьніцтвах, дзе больш высячанай плошчы.

Прэзыдыуму Акруговага Выканаўчага Комітэту даручана распрацаваць плян організацыі ў Шклоўскім, Чавускім, Кармлянскім і Журавіцкім раёнах лясных складаў для задавальненьня насельніцтва ляснымі матэрыяламі, а таксама хадайнічаць перад цэнтральнымі органамі аб водпуску лесу насельніцтву некаторых сельсаветаў Кармлянскага раёну з лясьніцтваў Гомельскай губэрні.

II. Савецкае будаўніцтва.

Заслухаўшы даклад аб савецкім будаўніцтве і пляне працы на зімовы пэрыод і адзначыўшы дасягненьні ў гэтай працы, пленум Магілеўскага АВК таксама адзначыў і цэлы шэраг недахопаў, як, напрыклад:

1. Невыстарчаючыя адносіны к справе скарыстаньня актыўнай часткі рабочых і сялян і слабое кіраваньне працаю комісій пры сельскіх саветах.

2. Невыстарчаючае кіраваньне з боку вышэйшых органаў нізавым апаратам, лішак масавых кампаній і так далей.

Для адхіленьня адзначаных недахопаў, пленум АВК пастанавіў:

1. Паглыбіць і ўзмацніць працу па ажыўленьню працы сельсаветаў, комітэтаў ўзаемадапамогі і г. д. і па інструктаваньню нізавога апарату праз выезды інструктароў і адказных працаўнікоў Акруговага Выканаўчага Комітэту і раённых выканаўчых комітэтаў.

2. У працягу бліжэйшых 2-х месяцаў адначасова з перавыбарамі сельскіх саветаў павінна быць скончана работа па організацыі пры ўсіх сельскіх саветах комісій.

3. Прымаючы пад увагу, што ўсе працаўнікі сельскіх саветаў не прашлі праз раённыя курсы—правесьці ў раёнах кароткатэрміновыя курсы перападрыхтоўкі старшынь і сакратароў сельсаветаў.

4. Лічыць абавязковым удзел на пленумах сельскіх саветаў кіраўнікоў усіх органаў, якія працуюць на абшары данага сельсавету.

5. Для больш актыўнага ўдзелу ў рабоце сельскага савету ўсіх яго членаў, лічыць неабходным на кожнага члена сельсавету ўскласьці абавязкі па абслугоўваньні грамадзян свае вёскі.

6. Прыняць рашучыя меры к пераводу дзелаводзтва савецкага апарату на беларускую мову, скончыўшы гэту працу да першага сьнежня 1926 году; асаблівую ўвагу зьвярнуць на работу нацыянальных сельскіх саветаў у сэнсе паляпшэньня іх дзейнасьці і пераводу іх дзелаводзтва на родную мову.

7. Не дапушчаць лішнюю перагрузку нізавога апарату многімі абежнікамі, правядзеньнем масавых кампаній, часта няўзгодненых паміж ведамствамі.

8. Ажывіць працу местачковых саветаў, уцягваючы ў іх працу саматужнікаў.

9. Асноўнаю задачаю ў кампаніі перавыбараў павінна быць уцягваньне ўсіх выбірацеляў, а таксама жанчын, маючы на ўвазе іх слабы ўдзел у гэтай рабоце ў прошлыя гады.

II. *Калінінскім Акруговым Выканаўчым Комітэтам* на пасяджэньні Прэзыдыуму 28 кастрычніка г. г. па дакладу аб працы Мсьціслаўскага Гарадзкога Савету пастаноўлена:

1) Правесьці плянавасьць у працы гарадзкога савету, адмежаваць працу паміж гарадзкім саветам і раённым выканаўчым комітэтам.

2) Організаваць пры гарадзкім савеце зямельную сэкцыю і абмеркаваць пытаньне аб магчымасьці організацыі жыльлёвых таварыстваў.

3) Узмацніць працу асобных сэкцый гарадзкога савету, заслухоўваючы даклады аб іх дзейнасьці на пленумах гарадзкога савету.

4) Узмацніць працу сярод саматужнікаў спосабам уцягненьня іх у актыўную работу.

III. *Прэзыдыум Полацкага Акруговага Выканаўчага Комітэту* на пасяджэньні 11 лістапада г. г. па пытаньні аб перавыбарах сельскіх і местачковых саветаў пастанавіў:

1) Правясьці перавыбары сельскіх і местачковых саветаў па ўсёй акрузе з 15 сьнежня па 1-е лютага 1926 году.

2) Падрыхтоўчую працу па перавыбарах і справаздачную кампанію распачаць з 20 лістапада.

3) Для кіраваньня перавыбарнай кампаніяй організована акруговая выбіральная комісія ў складзе 7-мі сяброў.

4) Раённым выканаўчым комітэтам, сельскім і местачковым саветам даручана організаваць выбіральныя комісіі не пазьней 25 лістапада—для раённых комісій і не пазьней 1 сьнежня г. г.—для сельскіх і местачковых комісій.

IV. 14-га лістапада г. г. адбылося пасяджэньне *Мозырскай Акруговай Выбіральнай Комісіі*, якая пастанавіла:

1) Справаздачную кампанію пачаць з 15 лістапада і скончыць к 15 сьнежня г. г.

2) Прапанаваць усім раённым выканаўчым комітэтам наступны парадак дня пры правядзеньні справаздачнай кампаніі: а) політычнае і гаспадарчае становішча БССР і СССР, б) справаздача РВК, в) справаздача комітэтаў узаемадапамогі і справаздача сельсаветаў.

3) Старшынямі раённых выбіральных комісій зацьверджаны ўсе старшыні раённых выканаўчых комітэтаў.

Па пытаньню аб перавыбарах сельсаветаў комісіяй пастаноўлена: пачаць перавыбары з 15-га сьнежня г. г. і скончыць да першага лютага г. г. Для перагляду сьпісаў асоб, якія пазбаўлены выбіральных праў, складзена асобная комісія.

III. Ахова здароўя.

Заслухаўшы даклад Акруговага Аддзелу Аховы Здароўя на пасяджэньні 4 лістапада г. г. Прэзыдыум Калінінскага АВК прызнаў неабходным:

1) Прапанаваць Акруговаму Аддзелу Аховы Здароўя ў бліжэйшы час распрацаваць для раённых выканаўчых комітэтаў падрабязныя указаньні для іх працы ў галіне аховы здароўя.

2) Для барацьбы з эпідэміяй на мясцох разьвіць мэтод масавага ўжываньня прывівак сярод насельніцтва і палепшыць пастаноўку справы наогул, для чаго дабіцца ад Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя рэгулярнага задавальненьня прывівачнымі матэрыяламі.

3) Прапанаваць Акруговаму Аддзелу Камунальнай Гаспадаркі даць аптэкакіраўніцтву будынкі для разьмяшчэньня ў Клімавічах аптэчных прадпрыемстваў.

Больш увагі падрыхтоўцы да перавыбараў Саветаў.

Савецкая дзяржава ёсьць дзяржава дыктатуры пролетарыяту. У Савецкай дзяржаве пануючую долю занімае рабочая кляса. Рабочая кляса вядзе, як правадыр, за сабою сялянства. Сялянства зусім дабраахвотна прызнае і павінна прызнаваць панаваньне і правадырства рабочага, бо яно добра разумее, што толькі праз шлях дыктатуры пролетарыяту сялянства зможа прыйсьці да новае, сьветлае комуністычнае будучыны. Гэта стварае падставу для саюзу рабочых і сялян, на аснове якога пад кіраўніцтвам Комуністычнае партыі магчыма далейшае будаваньне і разьвіцьцё Савецкіх рэспублік. Мы павінны заўжды клапаціцца аб тым, каб сувязь сялянства з рабочым была найбольш шчыльная і моцная.

Ясна, што гаворачы аб сялянстве, мы павінны разумець, што ня ўсе, хто носяць кажухі, роўна значаць і што сярод сялянства трэба адлічаць беднякоў, серадняков і кулакоў. Гэты падзел сялян па заможнасьці разам з гэтым паказвае іх адносіны да Савецкай улады, да рабочага і да Комуністычнае партыі. Бядняк ёсьць найбліжэйшы да пролетара, да рабочага, ён, як і рабочы, ня мае чаго траціць, а дапамогшы рабочаму ў барацьбе супроць буржуазіі і будаваньні соцыялізму, зможа заваяваць увесь сьвет,—таму бядняк бліжэйшы і вярнейшы хаўрусьнік рабочага. Серадняк састаўляе найбольшую частку сялянства. Свой дабрабыт ён можа палепшыць толькі пры Савецкай уладзе, бо пры капіталістычным парадку, пры панаваньні буйнога капіталу серадняк няўхільна ідзе па шляху аб'яднаньня. Дзеля гэтага і серадняку найбольш выгаднаісьці разам з рабочым. Кулак хацеў-бы тое, што ён нажыў, замацаваць за сабою і, маючы багацтва, камандаваць беднейшымі. Савецкая ўлада яму гэтага не дазволіць. Кулак—вораг рабочага, Савецкае ўлады.

Такім чынам, ведаючы, хто наш прыяцель і хто вораг, мы павінны замацаваць сувязь з прыяцелямі і зрабіць найменш шкоднымі нашых ворагаў.

У першую чаргу трэба не дапусьціць ворагаў саветаў у саветы. Трэба зьвярнуць больш увагі на перавыбары ў саветы.

Летась мы мелі шэраг прыкладаў таго, як кулак хацеў замацавацца ў сельсаветах і часта дабіваўся гэтага, карыстаючыся несьвядомасьцю бедняка і яго матэрыяльнай залежнасьцю ад кулака. Кулака і яго агэнтаў выбіралі ў саветы галасамі беднякоў і кулак, пападаючы ў савет, вёў работы проціў беднякоў і проціў саветаў. Да гэтага дапускаць нельга. Трэба перавыбары саветаў выкарыстаць дзеля ўмацаваньня саветаў, як адзіных організацый, у якіх селянін замацоўвае сваю сувязь з рабочым і разам з рабочым пад яго праваднірствам прымае ўдзел у кіраваньні савецкай дзяржавай і яе будаўніцтвам.

Комуністычная партыя па гэтым пытаньні вынесла такую пастанову:

„Пры правядзеньні політыкі ажыўленьня саветаў, уцягваньня ў іх працу мас беднякоў і серадняноў, партыя павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб аб‘яднаць навакол сябе беднату і весьці за сабой сярэдняе сялянства“.

У зьвязку з гэтым набывае надзвычайна важнае значэньне падрыхтоўка да перавыбараў у саветы, а разам з гэтым пастанова Комуністычнае партыі аб перавыбарных сходах беднаты. Нашы партыйныя організацыі павінны перад выбарамі сабраць беднату і разам з ёй падрыхтавацца да перавыбараў, каб на перавыбарных сходах выступіць організавана і правесьці ў саветы найбольш сьвядомых і адданых Савецкай уладзе беднякоў і серадняноў сялян, проціў кулакоў. Каб не папасьці пад хітрыкі кулакоў на выбарных сходах, трэба загадзя на перавыбарных сходах беднаты растлумачыць беднаце, што робіць Савецкая ўлада, каб дапамагчы беднаце, якія абавязкі выпадаюць у зьвязку з гэтым на сельсавет. Трэба таксама абгаварыць кандыдатаў у сельсавет, каб потым за гэтых кандыдатаў галасаваць, маючы на ўвазе, што ад таго, каго мы выберам у савет, будзе залежыць праца савету.

Зусім зразумела, што сходы беднякоў зацікавяць усіх сялян—і серадняноў і кулакоў. Трэба мець на ўвазе, што мы хочам замацаваць сувязь з серадняком. А таму, калі серадняк захоча разам з беднатой абгаварваць пытаньні аб дапамозе беднаце, трэба дапусьціць серадняка на бядняцкі сход—разумнага серадняка—і сказаць яму, што бедната вельмі жадае ісьці разам з серадняком за комуністычнай партыяй, калі сам серадняк добра зразумеў значэньне для яго саветаў, як дыктатуры пролетарыяту.

Комуністычная партыя надае такім сходам беднаты надзвычайна важнае значэньне. Ад удачнага сходу беднякоў будуць залежаць удачныя выбары ў сельсаветы. Вось чаму трэба да передвыбарных сходаў беднаты аднесьціся з вялікай увагай.

А. Чарвякоў.

К перавыбарам саветаў.

З 15 сьнежня па БССР пачнуцца чарговыя перавыбары сельскіх і местачковых саветаў. Але перавыбарная кампанія ўжо ў поўным разгары: на сельскіх, гарадзкіх і местачковых сходах сельскія і гарадзкія саветы і райвыканкомы даюць справаздачы насельнікам аб выпаўненай рабоце і выкладаюць свае пляны работ на наступны год; ідзе разьясьняльная работа як у друку, гэтак і вусная аб сыстэме і мэтодах (спосабах) перавыбару саветаў на грунце новай інструкцыі аб

перавыбарах, падгатаўляюцца сьпісы асоб, пазбаўленых выбарчых праў і г. д.

Вельмі цікавіцца надыходзячымі перавыбарамі і само насельніцтва як сельскае, гэтак і гарадзкое. Наагул, вёска за апошні год значна раскалыхнулася; яна стала актыўнай, з яе гушчаў вылучаюцца найбольш перадавыя элемэнты, якія імкнуцца прыняць актыўны ўдзел у палітычным, грамадзкім, культурным і гаспадарчым жыцьці рэспублікі. Гэтую актыўнасьць нашы кіруючыя органы як у цэнтры, гэтак і на мясцох павінны ўлічыць і правільна скарыстаць, асабліва цяпер—у момант перавыбараў саветаў. Неабходна наўкол гэтай кампаніі аб'яднаць лепшыя сілы вёскі—беднякоў і серадняков, накіраваўшы ўсю ўвагу на тое, каб абараніць апошніх ад шкоднага ўплыву на іх кулацкай часьці вёскі. Адначасна трэба правясьці шырокую кампанію для залучэньня найбольшага ліку насельнікаў, якія маюць выбарчае права, у актыўны ўдзел у перавыбарах сельскіх і местачковых саветаў і асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на залучэньне ў гэтую справу жанчын.

Паводле даных Народнага Камісарыяту Унутраных Спраў БССР, з 1.966.559 душ сельскага насельніцтва абодвых полаў у мінулую выбарчую кампанію (1924 г.) зьявілася на выбары сельскіх саветаў 697.622, што складае 35,47 проц., а з 977.537 жанчын, меўшых выбарчае права, зьявілася на выбары 146.719 душ, што складае 15 проц. Паколькі лічба ўдзелу насельніцтва (абодвых полаў) у перавыбарах сельскіх саветаў у 1924 годзе не зьяўляецца наагул здавальняльнай (асабліва, калі разглядаць яе па асобных раёнах, дзе ў шмат якіх яна была значна ніжэй), то лічбу ўдзелу жанчын можна назваць зусім нездавальняльнай. Бязумоўна, тут вінаваты глыбокія гістарычныя прычыны і тыя об'ектыўныя экономічныя і бытавыя ўмовы, у якіх пакуль што, жыве наша вёска. Але ўсё такі, пры добрай і ўмелай пастаноўцы работы ў вёсцы, можна было-б дасягнуць лепшых вынікаў. У гэтым годзе на гэты бок пытаньня перавыбараў неабходна зьвярнуць больш увагі, энэргіі і сіл і, можна спадзявацца, што жаданыя вынікі будуць.

У сакавіку месяцы гэтага году, з прычыны нездавальняльнасьці выбараў у саветы ў 1924 годзе, з 1208 сельскіх саветаў на тэрыторыі БССР было нанова перавыбрана 737 саветаў, што складае 61 проц.; прычым з 1.777.411 душ насельнікаў абодвых полаў, меўшых выбарчае права, на выбары зьявілася 459.578 душ, што складае 42,65 проц., у гэтым ліку з 519.518 жанчын скарысталі свае выбарчае права 87.418, што складае 16.82 проц.—таксама процант вельмі нездавальняльны.

Цяпер падагульнім даныя аб выбраных у саветы ў часе выбарчай кампаніі леташняга года, прычым паданыя ніжэй даныя будуць датыркаць ужо абноўленых саветаў, іначай—пасьля новых перавыбараў у сакавіку 1925 году.

Паводле соцыяльнага становішча выбарныя разьмяркоўваюцца ў такім парадку: з 19.000 членаў сельскіх саветаў, у 1208 сельсаветах па БССР:

Рабочых і парабкоў	779	або	4,10	проц.
Сялян	16.435	„	86,50	„
Служачых	1.786	„	9,40	„

(У 1923-24 г. было: рабочых 3,00 проц., сялян 95,00 проц. і служачых 2,00 проц.).

З членаў гарадзкіх саветаў у 13 гарсаветах БССР:

Рабочых	795	або	42,56	проц.
Служачых	546	„	29,23	„

Саматужн. і рамясьнікоў	69	„	3,69	„
Чырвонаармейцаў	237	„	12,68	„
Землябаў	143	„	7,66	„
Іншых	78	„	4,18	„

(У 1923-24 г. было: рабочых—32,4 проц., служачых—46,7 проц. чырвонаармейцаў—18,5 проц. і земляробаў—2,4 проц.).

З 1.286 членаў райвыканкомаў у 100 райвыканкомах:

Рабочых і парабкоў	182	або	14,15	проц.
Сялян	614	„	47,75	„
Служачых	490	„	38,10	„

(У 1923-24 г. членаў валасных выканаўчых комітэтаў было: рабочых—16,1 проц., сялян—68,4 проц. і служачых—15,5 проц.).

З 310 членаў акружных выканаўчых комітэтаў па 10 акружвыканкомах:

Рабочых	114	або	36,78	проц.
Сялян	166	„	53,55	„
Служачых	30	„	9,67	„

(У 1923-24 г. членаў павятовых выканаўчых комітэтаў было: рабочых—28,6 проц., сялян—31,4 проц., служачых—40 проц.).

Гэтыя лічбы сьведчаць аб вялікай перавазе рабочых і сялян, узятых разам па ўсіх нашых выбарчых савецкіх органах, але, аднак, у гарадзкіх саветах і райвыканкомах была значная праслойка „служачых“, прычым, параўнальна з 1923-24 г., колькасьць служачых скарацілася: па гарадзкіх саветах на 17,47 проц., а акружных выканаўчых комітэтах на 30,33 проц. і павялічылася: па сельскіх саветах на 7,40%, а раёных выканаўчых комітэтах на 22,50 проц. Як здаровае зьявішча, трэба адзначыць узмацненьне супроць 1923-24 г. гарадзкіх саветаў рабочымі на 10 з лішкам процантаў.

Паводле партыйнасьці выбарны склад нашых савецкіх органаў малюецца наступнымі данымі:

Па сельсаветах:

Членаў і кандыдатаў КП(б)Б	1.292	або	6,80	проц.
Членаў і кандыдатаў ЛКСМБ	1.463	„	7,70	„
Беспартыйных	16.243	„	85,49	„
Членаў іншых партый	2	„	0,01	„

(У 1923-24 г. было: комуністых—3,6 проц., комсамольцаў—0,3 проц. беспартыйных—95,8 проц., членаў іншых партый—0,3 проц.).

Па гарадзкіх саветах:

Членаў і кандыдатаў КП(б)Б	932	або	49,89	проц.
Членаў і кандыдатаў ЛКСМБ	120	„	6.42	„
Беспартыйных	816	„	43,69	„

(У 1923-24 г. было: комуністых—65,6 проц., комсамольцаў—2,8 проц. і беспартыйных—31,6 проц.).

Па раёных выканаўчых комітэтах:

Членаў і кандыдатаў КП(б)Б	735	або	57,16	проц.
Членаў і кандыдатаў ЛКСМБ	28	„	2,18	„
Беспартыйных	522	„	40,59	„
Членаў іншых партый	1	„	0,07	„

(У 1923-24 г. сярод членаў валасных выканаўчых комітэтаў было: комуністых—59,9 проц., комсамольцаў—4,2 проц. і беспартыйных—35,9 проц.)

Па акружных выканаўчых комітэтах:

Членаў і кандыдатаў КП(б)Б . . 212 або 68,38 проц.
Членаў і кандыдатаў ЛКСМБ . . 3 „ 0,96 „
Беспартыйных . . . . . . 95 „ 30,66 „

(У 1923-24 г. сярод членаў павятовых комітэтаў было: комуністых—90,9 проц. і беспартыйных—9,1 проц.).

З гэтых даных відаць. што па сельсаветах лік комуністых супроць 1923-24 г. павялічыўся на 3,2 проц., а комсамольцаў—на 7,4 проц. Гэта азначае, што, ня гледзячы на вельмі малую колькасьць членаў КПБ у сельскіх мясцовасьцях, уплыў іх на насельніцтва павялічваецца, таксама як і ўплыў ЛКСМБ. Што дачыняецца гарадзкіх саветаў, райённых і акружных выканаўчых комітэтаў, то тут процант комуністых супроць 1923-24 г. зьмяншаецца: нязначна ў райённых выканаўчых комітэтах (на 2,74 проц.), у значнай ступені ў гарадзкіх саветах (на 15,71 проц.) і даволі значна ў акружных выканаўчых комітэтах (на 22,52 проц.). Такі прогрэс у справе залучэньня беспартыйных у нашы выбарныя савецкія органы даводзіць, з аднаго боку, выстарчаючую моц і трываласьць іх, а з другога—актыўнасьць насельніцтва, якое вылучае на выбарныя пасады сваіх лепшых прадстаўнікоў, і правільнасьць узятага нашай партыяй кірунку па пытаньні залучэньня лепшых актыўных рабочых і сялян у савецкае будаўніцтва. Гэтага кірунку неабходна трымацца і ў далейшым, паглыбляючы яго.

Паводле нацыянальнага складу выбарныя савецкія органы ў БССР маюць наступны выгляд:

Назвы выбарных органаў.	У процантных адносінах.					У С Я Г О.
	Беларусаў.	Велікарусаў.	Гэбрэяў.	Палякоў.	Іншых.	
Сельскія саветы . . .	92.18	1,91	3,19	1,66	1,06	100
Гарадзкія „ . . .	39.40	20,55	30.09	3.27	6,69	100
Райвыканкомы . . .	81.81	6,46	6,53	1,48	3,72	100
Акружвыканкомы . . .	67,09	8.71	13.23	2,58	8,39	100
Агульны вывад .	86.85	3,82	5.76	1,79	1,78	100
У 1923-24 годзе нацыянальны склад быў такім:						
Сельскія саветы . . .	84.7	10,4	1,4	1,8	1,7	100
Гарадзкія „ . . .		дан	ых	ня	ма	
Валасныя вык. комітэты . .	75,4	21,5	1,3	0.9	0.9	100
Павятовыя „ „ .	48,1	22.4	19,5	3.3	6,7	100
Агульны вывад .	69.4	18,1	7,5	2.0	3,0	100

З гэтага параўнаньня лічбаў відаць, што ў цяперашнім складзе выбарных савецкіх органаў супроць складу іх у 1923-24 г. колькасьць беларусаў значна павялічылася ва ўсіх гэтых органах за рахунак, галоўным чынам, вялікарусаў. Павялічэньне гэтае мае наступны выгляд: па сельсаветах—на 7,48 проц., раённых выканаўчых комітэтах (супроць бывалешніх валасных выканаўчых комітэтаў)—на 6,41 проц. і па акружных выканаўчых комітэтах (супроць бывалешніх павятовых выканаўчых комітэтаў) на 18.99 проц. Ёсьць ведама, што і ў гарадзкіх саветах (аб ранейшым нацыянальным складзе якіх даных у нас няма) процант беларусаў таксама значна павялічыўся.

Колькасьць жанчын, выбраных у мінулую перавыбарную кампанію ў саветы, мае такі выгляд:

Па сельсаветах—2.000 або 10,53 проц. у адносінах да ўсяго складу сельсаветаў; па гарадзкіх саветах—305 або 16,33 проц.; раённых выканаўчых комітэтах—106 або 8,24 проц. і па акружных выканаўчых комітэтах—23 або 7,42 проц.

У ранейшым-жа складзе саветаў жанчын было: па сельсаветах—450 або 2,5 проц., гарадзкіх саветах—118 або 7.8, па валасных выканаўчых комітэтах—4 або 0,5 проц. і па павятовых выканаўчых комітэтах—толькі адна жанчына.

Гэта паказвае, што процант жанчын у цяперашнім складзе выбарных савецкіх органаў супроць ранейшага складу (1923-24 г.) значна павялічыўся, але ўсё такі ўдзел жанчын у саветах зьяўляецца яшчэ далёка не выстарчаючым і пры наступных выбарах на гэтае трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу і дамагчыся павялічэньня колькасьці жанчын у саветах.

Неабходна яшчэ крыху спыніцца на *нацыянальных сельскіх саветах.*

Паводле свайго імкненьня забясьпечыць за ўсімі нацыянальнасьцямі, якія залюдняюць БССР, права і мажлівасьць шырокага карыстаньня роднай мовай ва ўсіх савецкіх, грамадзкіх і іншых установах і організацыях, урад БССР пастанавіў неабходным утварыць нацыянальныя сельскія саветы (гэбрэйскія, польскія, латыскія і інш.) у тых сельскіх мясцовасьцях і мястэчках, дзе колькасна пераважае насельніцтва тае або іншае нацыянальнае меншасьці. Гэтае мерапрыемства было дэкрэтавана і мясцом была дадзена дырэктыва аб яго ажыцьцяўленьні. Паводле тых даных, якія маюцца, на тэрыторыі БССР у мінулым годзе было ўтворана 22 нацыянальныя сельскія саветы, менавіта: 11 гэбрэйскіх, 6 польскіх, 1 супольны польска-гэбрэйскі, 2 латыскіх і 2 нямецкіх. Найбольш усяго такіх сельскіх саветаў утворана ў Мазырскай акрузе (5); але ў некаторых акругах яны ня былі ўтвораны зусім (як у Аршанскай, Барысаўскай). Вестак аб тым, як працуюць гэтыя сельскія саветы, да гэтае пары ў нас няма і, наагул, работа іх нікім не вывучалася і толькі выпадкова ўдавалася даведацца аб некаторых такіх саветах, напрыклад: старшыня аднаго гэбрэйскага сельскага савету не валадае гэбрэйскаю моваю і ўся работа выпаўняецца на расійскай мове; другі выпадак: гэбрэйскі сельсавет выдаў аднаму грамадзяніну спраўку на гэбрэйскай мове на прадмет выдачы яму пропуску ў пагранічную паласу, але належная ўстанова гэтае спраўкі ня прыняла, адмовіўшыся няведаньнем гэбрэйскае мовы. Гэтыя два прыклады паказваюць, што жыцьцём і работаю ўтвораных нацыянальных сельскіх саветаў ніхто ня цікавіўся і не кіраваў імі і ў адносінах да правядзеньня нацыянальнае політыкі яны былі пакінуты самі сабе. У далейшым такія адносіны да нацыянальных сельскіх саветаў зьяўляюцца зусім недапушчальнымі. Іх роля павінна быць аграмаднаю ў адно-

сінах да правільнага абслугоўваньня насельніцтва адпаведнае нацыянальнасьці, якая павінна быць на сто процантаў забясьпечана на вольнае карыстаньне роднай мовай у сваім сельсавеце. Але адначасна павінна быць поўная зарука і для грамадзян (меншасьці) іншых нацыянальнасьцяй, пражываючых на тэрыторыі таго ці іншага нацыянальнага сельскага савету, што яны будуць упаўне абслужаны гэтым-жа сельскім саветам на іх роднай мове. Бязумоўна, у рабоце нацыянальных сельскіх саветаў могуць сустракацца цяжкасьці, але гэта тым больш павялічае важнасьць гэтага пытаньня і абавязвае як адпаведныя раённыя выканаўчыя комітэты, гэтак і асобных кіруючых працаўнікоў раёнаў і акруг самым уважлівым спосабам падыходзіць да гэтага пытаньня, пастаянна і ўсебакова вывучаючы яго і прымаючы неадкладныя меры для правільнага рэгуляваньня работы нацыянальных сельскіх саветаў. Пры надыходзячых перавыбарах саветаў на ўтварэньне нацыянальных сельскіх і местачковых саветаў мясцовыя кіруючыя органы павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу і вызначэньне пунктаў, дзе павінны быць утвораны гэтыя саветы, павінна быць дакладна і ўсебакова абдумана і разьлічна. Роўным чынам, павінна быць зьвернута вялікая ўвага і на падбор нацыянальных сельскіх і местачковых саветаў, галоўным чынам, старшынь і сэкратароў, для чаго неабходна правесьці сур'ёзную падгатоўчую кампанію сярод насельнікаў тых нацыянальных меншасьцяй, на тэрыторыі якіх мяркуецца ўтварыць гэтыя саветы.

